Co-funded by
the European Union

Youthpass



Дапаможнік

# ЦЭНІШ ТЫ, ЦЭНЯЦЬ ІНШЫЯ

## Як палепшыць бачнасць кампетэнцыяў, атрыманых у рамках Youthpass

JUGEND für Europa

SALTO
TRAINING & COOPERATION

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| i. | УВОДЗІНЫ | 4 |
| I. | НАВОШТА ГЭТЫ ДАПАМОЖНІК? КЛЮЧАВЫЯ ПЫТАННІ І ПАТРЭБЫ | 6 |
| I.1 | ПРЫЗНАННЕ НАВУЧАННЯ Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ МОЛАДЗЕВАЙ ПРАЦЫ | 6 |
| I.2 | ЗАЎВАГА НАКОНТ УЖЫВАННЯ І «ІНСТРУМЕНТАЛІЗАЦЫІ» МОЛАДЗЕВАЙ ПРАЦЫ | 10 |
| I.3 | МОЛАДЗЕВЫ ПАШПАРТ YOUTHPASS ЦЯПЕР | 10 |
| II. | КАМПЕТЭНЦЫІ: НАВУЧАННЕ, РЭФЛЕКСІЯ І ДАКУМЕНТАВАННЕ | 12 |
| II.1 | РЭФЛЕКСІЯ І НАВУЧАННЕ | 13 |
| II.2 | РОЛЯ ФАСІЛІТАТАРА | 26 |
| III.3 | ІНФАРМАВАННЕ ПРА КАМПЕТЭНЦЫІ | 29 |
| III. | ЯК ПАДТРЫМАЦЬ САМААЦЭНЬВАННЕ ДЛЯ МОЛАДЗЕВАГА ПАШПАРТУ YOUTHPASS | 30 |
| III.1 | «МНЕ ПАТРЭБНЫ МОЛАДЗЕВЫ ПАШПАРТ YOUTHPASS ДЛЯ СЯБЕ» | 32 |
| III.2 | САМААЦЭНЬВАННЕ ДЛЯ YOUTHPASS: АД АСАБІСТАГА КАРЫСТАННЯ ДА ІНШЫХ МЭТАЎ | 34 |
| III.3 | «Я ПАДАЮ ЗАЯЎКУ НА ПРАЦУ» | 36 |
| III.4 | «Я РЫХТУЮСЯ ДА ВАЛІДАЦЫІ МАІХ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ» | 41 |
| III.5 | «Я ХАЧУ ПРАЦЯГНУЦЬ АДУКАЦЫЮ І НАВУЧАННЕ» | 44 |
| IV. | ІНСТРУМЕНТЫ І ПАРАДЫ ДЛЯ САМААЦЭНЬВАННЯ І АПІСАННЯ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ | 48 |
| IV.1 | МЕТАДЫ | 51 |
| IV.2 | ПАРАДЫ І ПАДКАЗКІ | 108 |
| IV.3 | ІНШЫЯ РЭСУРСЫ ПА ГЭТЫХ ТЭМАХ | 112 |
| V. | ПРА ЎКЛАДАЛЬНІКАЎ | 118 |
| VI. | ПРА РЭСУРСНЫ ЦЭНТР ПРАФЕСІЙНАГА НАВУЧАННЯ І СУПРАЦОЎНІЦТВА SALTO І МОЛАДЗЕВЫ ПАШПАРТ YOUTHPASS | 119 |



# і УВОДЗІНЫ

## ПАВАЖАНЫ ЧЫТАЧ,

Праца над моладзевым пашпартам Youthpass мае істотную каштоўнасць – гэта адукацыйны працэс, які дадае моладзі самасвядомасці, упэўненасці і здольнасці разважаць над наступнымі планамі ў навучанні. Моладзевы пашпарт Youthpass таксама можа быць карысным, калі справа даходзіць да прадстаўлення сваіх кампетэнцыяў іншым людзям.

У Рэсурсным цэнтры Трэнінгаў  і Супрацоўніцтва SALTO (SALTO T&C) нас часта пытаюць пра вартасць і магчымасці пераносу дадзеных моладзевага пашпарту Youthpass у сітуацыях, калі маладому чалавеку можа спатрэбіцца прадставіць доказы сваіх кампетэнцыяў і досведу. «Як я магу прадставіць вынікі навучання такім чынам, каб яны абменьваліся на крэдытныя пункты або прызнаваліся ў заяўках на працу?» пытаюцца моладзевыя працаўнікі.

Гэты дапаможнік факусуецца на двух асноўных кантэкстах, у якіх уладальнікі Youthpass верагодна захочуць прадставіць свае кампетэнцыі – 1) калі яны прэтэндуюць на працу і 2) ў кантэксце фармальнай адукацыі і валідацыі. Перш чым пра вынікі навучання можна будзе расказаць, іх трэба сабраць і асэнсавана дакументаваць, таму мы прысвяцілі вялікую частку дапаможніка рэфлексіі.

Мы раім пачаць з размовы з удзельнікамі, каб абмеркаваць кантэкст, у якім яны збіраюцца выкарыстоўваць Моладзевы пашпарту Youthpass каб паказаць свае набытыя кампетэнцыі. Такая размова дапаможа вызначыць, якія часткі дапаможніка для вас найбольш актуальныя. Структура дапаможніка адлюстраваная ў наступнай дарожнай карце:




Спадзяёмся, гэты дапаможнік і дарожная карта дапамогуць вам і (маладым) людзям, з якімі вы працуеце, выпрацаваць сертыфікат, які можна паказаць з гонарам.

**Жадаем вам натхняльнага чытання!**

Крысціна Пэрніц
Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO



# 1 НАВОШТА ГЭТЫ ДАПАМОЖНІК? КЛЮЧАВЫЯ ПЫТАННІ І ПАТРЭБЫ

Дарко Марковіч

## 1. ПРЫЗНАННЕ НАВУЧАННЯ Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ МОЛАДЗЕВАЙ ПРАЦЫ

[1] Дэкларацыя 2-й Еўрапейскай канвенцыі па працы з моладдзю: https://pjp-eu.coe.int/en/web/youth-partnership/eywc-website-declaration.

У выніковай дэкларацыі II Еўрапейскай канвенцыі па працы з моладдзю[1] (2015 г.) гаворыцца, што *«моладзевая праца - гэта не раскоша, а экзістэнцыяльная неабходнасць, у сітуацыі, калі Еўропа павінна эфектыўна вырашаць свае праблемы з нагоды сацыяльнай інтэграцыі, згуртаванасці і роўных магчымасцяў, а таксама прыхільнасці каштоўнасцям дэмакратыі і правоў чалавека»*. Акрамя таго, паколькі нефармальнае і інфармальнае навучанне з'яўляецца адным з ключавых прынцыпаў моладзевай працы, не дзіўна, што Дэкларацыя таксама патрабуе пашырэння *«прызнання і валідацыі навучання і дасягненняў, здабытых праз моладзевую працу ў нефармальных і інфармальных асяроддзях навучання»*.

Гэты заклік да пашырэння прызнання каштоўнасці моладзевай працы і нефармальнага навучання не новы, хутчэй гэта чарговы этап у доўгім працэсе, які пачаўся яшчэ ў 1998 годзе. Выніковая Дэкларацыя 5-й канферэнцыі еўрапейскіх міністраў па справах моладзі Рады Еўропы ў Бухарэсце ў красавіку 1998 года аналагічна прапанавала дзяржавам-чальцам прызнаць здольнасці, якія маладыя людзі набываюць праз нефармальную адукацыю[2]. Нягледзячы на тое, што ў цэлым прагрэс здаецца павольным, шмат што палепшылася ў дачыненні да валідацыі нефармальнага навучання як у сферы адукацыі, так і ў сферы моладзевай працы[3]. У снежні 2012 года Еўрапейская рада выдала Рэкамендацыю[4] з просьбай стварыць стратэгіі па валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання да 2018 года. У моладзевай сферы дзякуючы запуску схемы Моладзевага пашпарту Youthpass у 2007 годзе адукацыйная каштоўнасць і фокус еўрапейскай моладзевай працы набылі большую бачнасць, і сталі аказваць значна больш адчувальны ўплыў на навучальныя дасягненні моладзі па ўсім кантыненце.

[2] Партнёрства паміж Еўрапейскай камісіяй і Радай Еўропы ў моладзевай сферы. Getting there… (2013)

[3] Darko Marković and Gülesin Nemutlu-Ünal. Адчыняючы дзверы да прызнання (SALTO Training & Cooperation Resource Centre, 2011). Overview of recognition developments (SALTO Training & Cooperation Resource Centre, 2016)

Праект «Аналіз і маніторынг моладзі ў дзеянні на аснове даследаванняў» (RAY) падкрэсліў, што ўдзел у праектах «Моладзь у дзеянні» (YiA) ЕС спрыяе развіццю ўсіх ключавых кампетэнцыяў навучання на працягу ўсяго жыцця[5]. У ім гаворыцца, што «У той час як найбольш выразнае развіццё назіраецца ў сферы міжасобасных, сацыяльных і міжкультурных кампетэнцыяў, а таксама камунікавання на замежнай мове, значнае развіццё таксама выяўляецца ў сферы прадпрымальніцтва, грамадзянскай кампетэнцыі, культурнай абазнанасці і выяўленчым мастацтве, а таксама ў кампетэнцыі навучання (навучанне ўменню вучыцца)»[6]. Спецыяльны «аналіз уключэння» дадзеных RAY паказвае, што ўплыў міжнароднай моладзевай працы на развіццё кампетэнтнасці мацнейшы для маладых людзей з меншымі магчымасцямі[7]. Выглядае, што калі прадстаўляюцца магчымасці і належная падтрымка, гэтая мэтавая група атрымлівае ад удзелу больш, чым іх аднагодкі, якія знаходзяцца ў лепшай жыццёвай сітуацыі. Яшчэ адно даследаванне RAY, якое праходзіла паміж кастрычнікам 2015 і красавіком 2016 падкрэсліла, што ўдзел у праектах Erasmus+ аказвае моцны ўплыў на развіццё ключавых кампетэнцыяў для навучання на працягу ўсяго жыцця[8].

[4] Рэкамендацыі Рады па валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання (2012)

[5] Ключавыя кампетэнцыі навучання на працягу ўсяго жыцця: https://ec.europa.eu/education/resources-and-tools/document-library/key-competences-for-lifelong-learning_en

[6] RAY. Моладзь у дзеянні мае значэнне (2013)

[7] Рэсурсны цэнтр SALTO і даследаванне RAY Уплыў мабільнасці на маладых людзей з меншымі магчымасцямі.

[8] RAY (2015-2016): https://www.researchyouth.eu/factsheet-key-competences

# ЗНАЧЭННЕ КЛЮЧАВЫХ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ ДЛЯ НАВУЧАННЯ НА ПРАЦЯГУ ЎСЯГО ЖЫЦЦЯ*

Большасць рэспандэнтаў «абсалютна згодныя» або «згодныя» з тым, што дзякуючы ўдзелу ў праекцеErasmus+ «Моладзь» яны палепшылі свае здольнасці...

**КК1 КАМУНІКАЦЫЯ НА РОДНАЙ МОВЕ**

... казаць тое, што я думаю, з перакананасцю. 88 %

**КК2 КАМУНІКАЦЫЯ НА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ**

... мець зносіны з людзьмі, якія размаўляюць на іншай мове. 93 %

**КК3 МАТЭМАТЫЧНЫЯ, НАВУКОВЫЯ І ТЭХНАЛАГІЧНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ**

... лагічна думаць і рабіць высновы. 79 %

**КК5 НАВУЧАННЕ ЎМЕННЮ ВУЧЫЦЦА**

... планаваць і ажыццяўляць навучанне самастойна. 73 %

**КК6 САЦЫЯЛЬНЫЯ І ГРАМАДЗЯНСКІЯ КАМПЕТЭНЦЫІ**

... ладзіць з людзьмі, якія маюць розныя погляды. 95 %

... дамаўляцца пра сумесныя рашэнні, калі ёсць розныя пункты гледжання. 90 %

... дасягнуць чагосьці ў інтарэсах супольнасці або грамадства. 88 %

**КК7 ПАЧУЦЦЁ ІНІЦЫЯТЫВЫ І ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА**

... вызначыць магчымасці для асабістага або прафесійнага развіцця. 86 %

... распрацаваць ідэю і ўвасобіць яе на практыцы. 85 %

**КК8 КУЛЬТУРНАЯ АБАЗНАНАСЦЬ І ВЫЯЎЛЕННЕ**

... выяўляць сябе творча ці артыстычна. 80 %

16.373 удзельнікаў, апытанне, праведзенае ў кастрычніку 2015 - красавіку 2016 года.

Крыніца: RAY research factsheet

Паколькі навучанне ў моладзевай сферы звязана не толькі з навучаннем на працягу ўсяго жыцця, але і з грамадзянскай супольнасцю, то яно ўплывае як на асабістае і сацыяльнае развіццё асобных людзей, так і на перспектывы іх працаўладкавання. Даследаванне Еўрапейскага моладзевага форуму[9] ў 2013 годзе ў 40 еўрапейскіх краінах выразна паказала, што існуе адпаведнасць паміж навыкамі, запатрабаванымі працадаўцамі, і навыкамі, распрацаванымі ў праектах па працы з моладдзю. У прыватнасці, у дакладзе гаворыцца, што «з 6 навыкаў і кампетэнцыяў, якія часцей за ўсё згадваюцца як запатрабаваныя працадаўцамі (...), пяць уваходзяць у лік тых, якія ў большай ступені развіваюцца праз удзел у моладзевых арганізацыях (...), а менавіта камунікацыйныя навыкі, арганізацыйныя/навыкі планавання, навыкі прыняцця рашэнняў, навыкі працы ў камандзе, упэўненасці/аўтаноміі (...)». Яшчэ адно даследаванне, якое было сфакусаванае выключна на развіцці кампетэнцыяў у праектах Еўрапейскай валанцёрская службы (EVS),[10] таксама выявіла істотныя суадносіны паміж кампетэнцыямі, якія цэняцца працадаўцамі, і тымі, якія набываюць валанцёры EVS.

З пункту гледжання фармальнай адукацыі, праца з моладдзю аказвае станоўчы ўплыў на дасягненні навучэнцаў шляхам умацавання некагнітыўных навыкаў, такіх як настойлівасць, матывацыя, міжасобасныя навыкі і самаэфектыўнасць[11] (Shernoff і Lowe Vandell, 2007, 2008). Даследаванні таксама паказваюць, што найбольшае значэнне мае менавіта якасць моладзевай працы. Якасць досведу моладзевай працы можа быць мацнейшым і больш пазітыўным прадказальнікам акадэмічнай паспяховасці, чым колькасць такога досведу. (Shernoff, 2010). Акрамя таго, моладзевая праца грае важную ролю ў прадстаўленні альтэрнатыўных шляхоў для моладзі, якая спыняе адукацыю і навучанне[12]. Такім шляхам моладзь можа вярнуцца да фармальнай адукацыі альбо проста прыйсці да набыцця новых кампетэнцыяў (і/або новых кваліфікацыяў) праз нефармальнае і інфармальнае навучанне.

Выглядае, што сёння маецца дастаткова доказаў таго, што моладзевая праца чыніць значны ўплыў на развіццё кампетэнцыяў моладзі,[13] што таксама пацвярджаецца ва ўсё большай колькасці нацыянальных даследаванняў[14 15]. Аднак часта адсутнічаюць спосабы і інструменты «пераносу» гэтых кампетэнцыяў на іншыя сферы – у першую чаргу на адукацыю і занятасць. Магчыма, пасля пэўнага ўзроўню прызнання моладзевымі працаўнікамі і маладымі людзьмі ўзнікае неабходнасць знайсці спосабы забеспячэння варыянтаў як «канцэптуальнага пераносу» (аднолькавае разуменне тэрмінаў), так і «практычнага пераносу» кампетэнцыяў, набытых у моладзевай сферы праз прымяненне ў іншых сацыяльных кантэкстах. Мы спадзяёмся, што гэты дапаможнік адкрые новыя дзверы і маршруты да такога прызнання для карыстальнікаў Моладзевага пашпарту Youthpass.

[9] Manuel Souto-Otero, Daniela Ulicna, Loraine Schaepkens, Viktoria Bognar. Даследаванне ўплыву нефармальнай адукацыі ў моладзевых арганізацыях на працаўладкаванне моладзі (Еўрапейскі моладзевы форум,, 2013)

[10] Özgehan Senyuva. Кампетэнцыі EVS ў галіне занятасці (2014), Кампетэнцыі EVS ў галіне занятасці. Поўны даклад пра даследаванне (Цэнтр інклюзіўнасці SALTO і Цэнтр SALTO для Паўднёва-Усходняй Еўропы)

[11] Shernoff and Lowe Vandell. Моладзевае заангажаванняў пазашкольныя праграмы: Погляд на падставе матрыцаў досведу (2007, 2008), David J. Shernoff (2010)

[12] Allison Dunne, Daniela Ulicna, Ilona Murphy, Maria Golubeva. Праца з моладдзю: значэнне моладзевай працы ў Еўрапейскім саюзе (Еўрапейская камісія, 2014) с. 145

[13] Там жа, ст. 139-140

[14] Схаваныя кампетэнцыі – вынікі даследавання: развіццё кампетэнцыяў праз працу і міжнародную мабільнасць (2013), доступ: : https://www.cmepius.si/wp-content/uploads/2015/09/Sari-Turunen-Zwinger_Hidden-Competences-Study-Results.pdf.

[15] Sever Džigurski and Darko Marković. Даследаванне ўплыву НФА на моладзевую працу (NAPOR, 2014)

## 2. ЗАЎВАГА НАКОНТ МАГЧЫМАСЦЯЎ ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ І «ІНСТРУМЕНТАЛІЗАЦЫІ» МОЛАДЗЕВАЙ ПРАЦЫ

Заклік да шырэйшага прызнання моладзевай працы і нефармальнага навучання важны не толькі да магчымасцяў працаўладкавання. Павінна быць зразумела, што моладзевая праца і нефармальнае навучанне маюць каштоўнасць самі па сабе. Яны адыгрываюць неверагодна важную ролю ў падтрымцы інклюзіўнасці, дабрабыту, цэласнага развіцця і, у канчатковым рахунку, пашырэння правоў і магчымасцяў моладзі. Гэта важныя пляцоўкі адукацыйнай практыкі, якія заслужылі належнае сацыяльнае прызнанне як з пункту гледжання статусу, так і з пункту гледжання фінансавых укладанняў.

Аднак, калі па ўсёй Еўропе пачаў павышацца ўзровень беспрацоўя сярод моладзі, тэма здольнасці да працаўладкаваня хутка паднялася ўверх на палітычным парадку дня. Рашэнні шукаліся ў розных сферах, у тым ліку ў моладзевай працы. Важна падкрэсліць, што сама праца з моладдзю не можа і не павінна быць адзіным вырашэннем пытання беспрацоўя сярод моладзі, бо дэфіцыт працоўных месцаў патрабуе сістэмнага рашэння, на якое мусяць уплываць іншыя палітычныя аспекты. Тым не менш, удзел моладзі ў (мясцовай і міжнароднай) моладзевай дзейнасці сапраўды развівае важныя кампетэнцыі, якія могуць быць карыснымі на рынку працы, у прадпрымальніцтве ці, магчыма, у фармальнай адукацыі.

Калі вы моладзевы працаўнік, вы цалкам можаце развіваць уласную пазіцыю ў дачыненні да гэтых пытанняў і вырашаць, што гэтая пазіцыя азначае для вашай ролі. Хоць вам не трэба станавіцца кансультантам па працаўладкаванні або кар'ерным трэнерам, але можа быць карысна мець уяўленне гэтай вялікай карціны і цікавіцца інфармацыяй па праблемах, звязаных з занятасцю. Дык не, гэты Дапаможнік не мае намеру «інструменталізаваць» моладзевую працу. Хутчэй, ён прызначаны дапамагчы моладзевым працаўнікам эфектыўна рэагаваць на патрэбы маладых людзей, з якімі яны працуюць.

## 3. МОЛАДЗЕВЫ ПАШПАРТ YOUTHPASS ЦЯПЕРТ

Youthpass быў уведзены ў 2007 годзе ў рамках праграмы ЕС Youth in Action (YiA) у якасці інструмента для прызнання вынікаў навучання, атрыманых у рамках мерапрыемстваў, якія

падтрымліваюцца праграмай. Удзельнікі выкарыстоўваюць сертыфікаты Youthpass для апісання таго, што яны даведаліся падчас сваіх праектаў. Такім чынам, праз дакументаванне набытых кампетэнцыяў удзельнікаў, Youthpass не толькі падтрымлівае маладых людзей у адлюстраванні іх асабістага працэсу навучання, але і спрыяе сацыяльнаму прызнанню моладзевай працы і паляпшэнню магчымасцяў для працаўладкавання моладзі. Паміж 2007 годам, калі сертыфікат быў уведзены, і кастрычнікам 2019 года было выдадзена больш за мільён сертыфікатаў Youthpass.

У 2012-2013 гадах Еўрапейская камісія правяла даследаванне эфекту Youthpass[16] для ацэнкі ўплыву моладзевага пашпарта на ўдзельнікаў праграмы ЕС YiA, працу арганізацый, якія ўдзельнічаюць у праграме, а таксама на прызнанне моладзевай працы і нефармальнага навучання. Даследаванне прадэманстравала, што маладыя людзі і моладзевыя арганізацыі працы высока цэняць аспект Youthpass, які тычыцца самаацэнкі. Унёсак Моладзевага пашпарту Youthpass у павышэнне абазнанасці пра свае дасягненні ў навучанні і прадстаўленне сваіх кампетэнцыяў іншым таксама пацверджаны вынікамі апытання маніторынгу RAY[17], у якім 83% удзельнікаў, якія праводзілі рэфлексію ці самаацэнку ў рамках Youthpass, прызналі, што гэта дапамагло павысіць ім лепш усвядоміць сваё развіццё і навучанне на працягу ўсяго праекту. Праз 2-11 месяцаў пасля заканчэння праекту 30% уладальнікаў сертыфікату Моладзевага пашпарту Youthpass заявілі, што выкарыстоўвалі яго ў пэўным кантэксце, а 69% палічылі, што сертыфікат быў карысным. Даследаванне ўплыву таксама падкрэсліла, для многіх маладых людзей няпроста запісаць вынікі самаацэнкі, ім патрэбна падтрымка. Моладзевыя работнікі таксама прасілі падтрымкі і кіраўніцтва ў сваёй працы з моладдзю па аспекце фармулявання вынікаў самаацэнкі.

[16] УДаследаванне ўздзеяння Моладзевага пашпарту Youthpassу: https://www.youthpass.eu/en/about-youthpass/youthpass-impact-study/

[17] Даследуючы Erasmus+ «Моладзь». Эфекты і вынікі праграмы ERASMUS+ «Моладзь» з гледзішча ўдзельнікаў праекту і яго кіраўнікоўз (2017), accessible here: http://www.researchyouth.eu/results-erasmus-youth-in-action

Мэта дадзенай публікацыі - прадставіць моладзевым працаўнікам, ментарам і трэнерам ідэі, рэсурсы і інструменты, каб дапамагчы маладым людзям сфармуляваць свае вынікі навучання такім чынам, каб іх адэкватна разумелі іншыя людзі. Гэты працэс не пачынаецца напрыканцы праекту. Хутчэй, ён патрабуе ад удзельнікаў адсочваць і асэнсоўваць сваё навучанне па меры яго развіцця. Занатоўванне падчас рэфлексіі на розных этапах можа быць вельмі карысным як нагадка ўдзельнікам пра тое, што яны даведаліся пасля заканчэння праекту. Тым не менш, вынікі навучання ўсё ж павінны быць сфармуляваныя такім чынам, каб іх разумелі людзі з па-за межаў міжнароднай супольнасці працы з моладдзю.

Маладым людзям трэба знайсці правільныя словы, каб апісаць свае вынікі навучання і кампетэнцыі не толькі з мэтай запаўнення сертыфіката Моладзевага пашпарту Youthpass. Сёння - і тым больш у будучыні - пры пошуку працы або пачатку бізнесу ўменне апісваць свае кампетэнцыі будзе важным навыкам, часам больш каштоўным, чым сертыфікат. Давайце ж знойдзем трапныя словы для апісання нашых кампетэнцыяў!



# 11 НАВУЧАННЕ, РЭФЛЕКСІЯ І ДАКУМЕНТАВАННЕ СВАІХ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ

Аўтар Paul Kloosterman

# 1. РЭФЛЕКСІЯ І НАВУЧАННЕ

Некаторыя формы навучання ўсвядоміць лягчэй, чым іншыя. Каб навучыцца пекчы хлеб, трэба троху часу, вады і іншых складнікаў, але гэта можна зрабіць канкрэтнымі крокамі. Паміж гэтымі крокамі можна разважаць аб розных частках працэсу і зразумець, што важна доўга мясіць цеста, што цеста падняцца, і што не варта павышаць тэмпературу ў печы, каб выпекчы хлеб хутчэй. Гэта даволі простая рэфлексія, якая адбываецца ўвесь час у дачыненні да рэчаў, пра якія мы даведваемся па жыцці. Гэта чалавечая прырода, мы разважаем, каб у наступны раз зрабіць лепш. Гэта не тая форма рэфлексіі, якая займае шмат часу. На самай справе, гэта адбываецца амаль аўтаматычна.

Працэсу навучання, які праходзіць моладзь у еўрапейскіх моладзевых праграмах, больш складаны. Удзельнікі моладзевых абменаў, валанцёрскіх праектаў, навучальных курсаў і іншых відаў дзейнасці праходзяць праз такое навучанне, якое часта больш звязанае з асабістым развіццём, сацыяльнымі навыкамі, абазнанасцю, упэўненасцю ў сабе і г.д. Гэта ўсе навыкі, якія не засвойваюцца па выкананні некалькіх простых крокаў. Мы не можам проста паставіць птушачкі і адзначыць гэтыя рэчы як зробленыя. Нельга сказаць: «Цяпер я цалкам самасвядомы/ая!» або «ўпэўненасць у сабе: зроблена!»

Вывучэнне ўласных паводзінаў, сваіх перакананняў, дачыненняў з іншымі і асабістых мэтаў у жыцці - гэта працэс, які ніколі не заканчваецца. Мы робім у ім крокі наперад, часам крокі назад, і адначасова з'яўляюцца новыя пытанні і новыя мэты. Вызначыць дакладны момант, калі мы праходзім навучальны працэс, звязаны з развіццём асобы, складана і таму, што гэта адбываецца ў сітуацыях, якія часта незапланаваныя. Гэта не значыць, што падчас праграмы ёсць адна сесія пра асертыўнасць, і пасля гэтай сесіі ўдзельнікі ведаюць, як быць асертыўнымі. Хутчэй за ўсё, яны могуць апынуцца ў розных сітуацыях падчас праграмы – на кававым перапынку, ці, магчыма, расслабіцца з іншымі ўдзельнікамі ўвечары – дзе яны больш праяўляюць сваю асертыўнасць. Магчыма яны сапраўды гэта планавалі, але часам гэта магло проста адбыцца, і ўдзельнікі зразумелі гэта толькі ў той самы момант ці праз дзень.

Усё гэта робіць рэфлексію больш складанай, але ў той жа час рэфлексія мае важнае значэнне для навучання. Гэта не толькі дапамагае нам усвядоміць тое, чаму мы навучыліся, але і вучыць нас разумець, як адбывалася гэтае навучанне. Іншымі словамі, рэфлексія дапамагае, з аднаго

боку, фіксаваць досвед навучання. З другога боку, яна дапамагае нам падрыхтавацца да працягу гэтага працэсу.

Нарэшце, фармуляванне таго, чаму мы навучыліся, словамі, дазваляе нам паведамляць гэтую інфармацыю іншым. Апошні момант пра тое, чаму рэфлексія адыгрывае такую важную ролю ў гэтай публікацыі: яна падказвае нам, як распавядаць пра свае навучальныя дасягненні іншым, і як разглядаць рэфлексію як да неад'емную частку працэсу навучання.

**Чаму трэба рэфлексія пра навучанне?**

- РАСПАВЕСЦІ ПРА СВАЁ НАВУЧАННЕ ІНШЫМ
- ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ САМАСВЯДОМАСЦІ
- БЫЦЬ БОЛЬШ СВЯДОМЫМ У СВАІМ НАВУЧАННІ
- КАБ ПЛАНАВАЦЬ ДАЛЕЙШАЕ НАВУЧАННЕ
- ЗАПІСАЦЬ ТОЕ, ЧАМУ НАВУЧЫЛІСЯ
- КАБ ЗРАЗУМЕЦЬ, ЯК ВЫ ВУЧЫЦЕСЯ

# РЭФЛЕКСІЯ І ЗАПІС

Запіс досведу напрыканцы дня або тыдня дапамагае навучэнцам запомніць тое, што яны зрабілі, і азірнуцца на гэты досвед з пэўнай адлегласці.

Сам працэс запісу можа быць выдатным спосабам рэфлексіі. Калі навучэнцы сядаюць у спакоі і пішуць, яны вяртаюцца да сваіх перажыванняў і перакладаюць іх на словы. Гэта дазваляе ім азірнуцца назад, але часта і дадае нейкі новы досвед. Удзельнік моладзевага абмену, які з задавальненнем удзельнічае ў мностве розных мерапрыемстваў, дыскусіяў і інтэнсіўнай працы ў камандзе са сваімі аднагодкамі, будзе мець разнастайныя ўражанні ў той самы момант, калі гэта адбываецца. Аднак вяртаючыся да гэтых падзей пазней і паглядзеўшы на іх здалёк, ён можа атрымаць новае разуменне. Запіс уласных уражанняў, ідэяў, высноў і пытанняў дапамагае разважаць і вучыцца.

Добрая навіна ў тым, што ўдзельнікі робяць гэта для сябе, а гэта значыць, што няма неабходнасці пісаць прыгожую прозу, што арфаграфічныя памылкі не праблема, і што галоўнае, каб запіс мог разабраць сам аўтар. Вядома, шмат хто любіць пісаць ідэальныя сказы і стараецца знайсці найбольш прыдатныя словы, і гэта таксама цудоўна! Аднак «пісьменнікі» - не адзіныя людзі, якія могуць разважаць і запісваць вынікі сваёй рэфлексіі. Некаторым цалкам хапае запісаць нейкія словы, нешта намаляваць, выдзеліць словы па ўсёй старонцы рознымі колерамі, напісаць верш ці зрабіць здымак. Усё гэта падыходзіць, калі дапамагае ўдзельнікам абдумаць тое, што адбылося, глядзець на сябе і ў сябе і бачыць, як змяніўся іх досвед – іншымі словамі, праводзіць самарэфлексію. Варта дадаць, што такі спосаб спрацуе пры ўмове, што нататкі ўсё яшчэ будуць зразумелыя праз некалькі месяцаў. У той момант удзельнікі, магчыма, будуць бачаць рэчы з іншага пункту гледжання і прыйдуць да новых ідэяў і вынікаў навучання.

Больш традыцыйным спосабам рабіць нататкі і разважаць над сваім досведам з'яўляецца звычайны дзённік. Нататнік з чыстымі старонкамі і алоўак - усё, што трэба. Можна таксама выкарыстоўваць нататнік большага памеру і каляровыя алоўкі, а таксама клей, каб наляпіць на малюнкі і іншыя матэрыялы. Магчыма, гэта ўжо не модна, але многія маладыя людзі любяць весці дзённік і паўсюль насіць яго з сабой, каб напаўняць яго словамі, гісторыямі, думкамі, малюнкамі, вершамі і г. д., седзячы ў ціхім месцы і пішучы, каб пісаць толькі для сябе.

Трохі менш традыцыйнай практыкай – але шмат у чым падобнай – з'яўляецца стварэнне электроннага дзённіку на камп'ютары ў Word. Існуе таксама вялікая колькасць (у асноўным

бясплатных) вэб-сайтаў, вэб-інструментаў і праграм для вядзення анлайн-дзённіку. Існуюць разнастайныя фарматы і функцыі. Проста ўвядзіце «анлайн-дзённік» у поле пошуку. Многія інструменты дазваляюць карыстальнікам дадаваць здымкі і нават відэакліпы. Быццам бы ў іх увесь час з сабой асабісты дзённік. Большасць гэтых інструментаў можна захоўваць у строга закрытым рэжыме або дзяліцца імі з некаторымі людзьмі ці нават з усім светам. Падзяліцца з усім светам таксама можна, калі ў якасці дзённіка выкарыстоўваецца блог. Запісы ў такім фармаце не з'яўляюцца прыватнымі, што можа абмяжоўваць, што і як вы пішаце, але гэта выдатны фармат для людзей, якія любяць дзяліцца сваімі думкамі і досведам. Блогі таксама дазваляюць аўтарам атрымліваць зваротную сувязь ад чытачоў, што можа быць карысным.

У гэтай публікацыі мы шмат гаворым пра тое, як ідэнтыфікаваць і камунікаваць іншым канкрэтныя вынікі навучання. Рэфлексія - гэта этап, які адбываецца перад камунікаваннем. Гэта не значыць, што дзённік павінен быць доўгім спісам вынікаў навучання па радках «цяпер я гэта ведаю», «цяпер я магу гэта зрабіць» і г.д. Фармат дзённіка дазваляе задаваць пытанні і развіваць ідэі. У гэтым сэнсе рэфлексія - гэта значна больш апісанне самога працэсу. Пры працы над апісаннем вынікаў навучання ўсе словы, сказы, гісторыі, малюнкі і здымкі ў дзённіку будуць вельмі карысныя аўтару ў асэнсаванні таго, што ён даведаўся.



# Пачатак працы

Маладым людзям можа спатрэбіцца дапамога ў напісанні і структураванні свайго дзённіка. Ніжэй прыведзены некалькі прыкладаў і інструментаў, якія могуць быць карыснымі.

## Тыповыя пытанні

Пры запуску працэсу рэфлексіі і запісу можа быць карысным набор пытанняў у фармаце «Я»:

- Што мне больш за ўсё сёння спадабалася?
- Што зрабіла на мяне найбольшае ўражанне?
- Якія цікавыя кантакты ў мяне былі?
- Што мяне сёння найбольш у сабе задавальняе?
- Што мяне сёння збянтэжыла?
- Ці зрабіў я нейкае адкрыццё ?
- Што мне падалося цяжкім?
- Як я спраўляўся са складанымі сітуацыямі?
- Што я для сябе адкрыў?
- Якія новыя ідэі прыходзілі мне ў галаву?
- Ці я хацеў бы зрабіць нешта інакш у наступны раз?
- Якія новыя пытанні ў мяне ўзніклі?
- Якія новыя планы я сёння задумаў?
- З кім я хачу паразмаўляць зноў?
- Якой метафарай можна апісаць сённяшні дзень?
- Якую адзнаку я б паставіў гэтаму дню?
- Калі б гэты дзень быў жывёлай/транспартным сродкам/музычным інструментам, што б гэта было?

(Дарэчы, не ўсе гэтыя пытанні трэба выкарыстоўваць! Проста выберыце некалькі.)

# Структураваць свае думкі з дапамогай трох пытанняў

Гэты метад дапамагае аналізаваць досвед такім чынам, каб аддзяліць факты ад пачуццяў. Часта, азіраючыся на сітуацыю, чалавек блытае тое, што насамрэч адбылося з эмацыйнай рэакцыяй на падзею.

## Адказаць на гэтыя тры пытанні:

- Што здарылася?
- Як я сябе адчуваў?
- Што я хачу зрабіць інакш у будучыні?

У гэтым практыкаванні важна адказваць на пытанні адзін за адным, і сачыць, каб у адказах навучэнцы запісвалі толькі тое, што адбылося. Гучыць лёгка, але часта даволі складана абмежаваць сябе толькі фактамі. Напрыклад, фраза «Гэта быў цудоўны сонечны дзень, і да нашай дзейнасці далучылася шмат людзей» не была б добрым адказам на першае пытанне. «Падчас практыкавання свяціла сонца, было 24 градусы, 46 чалавек прынялі ўдзел у мерапрыемстве» - так апісаць тое, што адбылося на самай справе было б больш правільна. На другое пытанне адным з магчымых адказаў было б: «Мне вельмі спадабалася цёплае надвор'е, і я быў здзіўлены, што так шмат людзей далучылася да мерапрыемства». Трэцяе пытанне з'яўляецца больш ацэначным і дапамагае ўдзельніку думаць пра альтэрнатыўныя паводзіны і адказы. Працэс нялёгкі, але гэта цікавы спосаб разважаць.

## ПРАЦЭС МОЛАДЗЕВАГА ПАШПАРТУ YOUTHPASS

«Гэта больш, чым сертыфікат!» Так скажуць многія, калі спытаць іх пра Youthpass. У пэўным сэнсе сертыфікат - гэта канчатковы вынік. Каб да яго прыйсці, удзельнікі праходзяць праз працэс навучання падчас моладзевага абмену, навучальнага курса або валанцёрскай праграмы. Так званы «працэс Youthpass» нарадзіўся з ідэі ператварыць гэты працэс навучання ў свядомы досвед у якім маладыя людзі ўсведамляюць, што яны вучацца, выбіраюць тое, чаму яны хочуць навучыцца, вывучаюць розныя спосабы навучання, адчуваюць адказнасць за працэс навучання, а таксама ацэньваюць гэты працэс. Працэс Youthpass ідэальна падыходзіць для канцэпцый навучання на працягу ўсяго жыцця і навучання ўменню вучыцца. Важна развіваць здольнасць браць на сябе адказнасць і прымаць рашэнні аб уласным навучанні, бо тады гэты працэс ператворыцца ў навучанне на працягу ўсяго жыцця. *Гартаючы моладзевы пашпарт Youthpass*[18] падказвае мноства прыкладаў і шырокае даследаванне працэсу Youthpass.

[18] Гартаючы моладзевы пашпарт Youthpass – Практычныя парады і дзейныя метады, каб атрымаць максімальную выгаду ад працэсу Моладзевага пашпарту Youthpass (2012 – абноўлены ў 2016). Доступ: https://www.salto-youth.net/downloads/4-17-3553/Publication_YP-unfolded_online.pdf

Цяпер давайце даследуем адзін з элементаў працэсу Youthpass: самаацэнку.

## ЧАМУ САМААЦЭНКА ВАЖНАЯ?

«Ці сапраўды вы найлепшы чалавек, каб ацаніць уласнае навучанне?» гэта добры спосаб пачаць дыскусію пра самаацэнку. Наступнае пытанне можа быць: «Хто можа вырашаць лепш за вас, што вы даведаліся?» Многія людзі прывыклі да сістэмы, у якой іншыя людзі вырашаюць, у якой ступені дасягнуты меркаваны вынік навучання, альбо ці ён наогул дасягнуты. Іншыя людзі праводзяць тэсты, робяць інтэрв'ю, рыхтуюць экзамены і ацэньваюць чыесьці вынікі навучання. Сапраўды, ёсць даволі шмат прафесій, дзе варта праверыць кандыдатаў, перш чым яны пачнуць працаваць. Ніхто не захацеў бы, каб яму рабіў аперацыю хірург, які не здаваў экзаменаў.

Тым не менш, тэсты і экзамены як інструменты ацэнкі кампетэнцыяў іншых людзей маюць свае абмежаванні. Яны ацэньваюць толькі навыкі чалавека ў той канкрэтны момант, і часта іх

вынік шмат у чым залежыць ад таго, наколькі добра кандыдат справіўся з тэставай сітуацыяй. Тэст або экзамен разглядаюцца як своеасаблівая канчатковая ацэнка, гэта значыць, што калі вы здалі экзамен, вы нешта «добра робіце». Аднак гэта на самай справе не адпавядае канцэпцыі навучання на працягу ўсяго жыцця, якая прызнае, што кампетэнцыі могуць вельмі хутка састарэць. Ніхто не захацеў бы, каб яму рабіў аперацыю хірург, які здаваў 18 гадоў таму і з тых часоў не прайшоў дадатковую падрыхтоўку.

Што тычыцца навучання, якое адбываецца праз дзейнасць у рамках еўрапейскіх моладзевых праграмаў, самаацэнка здаецца значна больш прыдатным спосабам выяўлення вынікаў навучання і іх каштоўнасці. Навучэнцы лепш за каго ведаюць, якое асабістае развіццё яны здзейснілі, як яны палепшылі свае навыкі камунікавання, чаму яны адчуваюць сябе больш упэўненымі ў сабе і сталі лепшымі арганізатарамі і г.д. Пры ацэнцы ўласнага навучання маладыя ўдзельнікі становяцца значна больш дасведчанымі ў гэтым плане, што пасля дазваляе ім лепш планаваць сваё далейшае навучанне.

Аднак гэта не азначае, што навучэнцам не патрэбныя іншыя людзі, каб ацаніць іх навучанне. Самаацэнка - гэта не тое, што людзі робяць выключна самі. Тут «сама-» адносіцца да таго, што самі навучэнцы ў канчатковым рахунку нясуць адказнасць за ацэнку. Гэта не тое самае, што рабіць гэта без дапамогі іншых. Хоць маладыя ўдзельнікі, напэўна, ведаюць сябе лепш чым хто, яны (як і ўсе мы!) па-ранейшаму маюць няпоўнае або адрознае ўспрыманне сваіх паводзін і навыкаў. Іншыя людзі бачаць нас з іншага пункту гледжання і, такім чынам, могуць бачыць тое, чаго мы не бачым, і/або надаюць іншую каштоўнасць нашым паводзінам і навыкам. Аналагічна, аднагодкі, калегі, трэнеры, ментары і моладзевыя працаўнікі будуць бачыць, як маладыя ўдзельнікі ўзаемадзейнічаюць і працуюць падчас праекту, і безумоўна ў іх будуць ўражанні, якімі яны могуць падзяліцца. Іх уражанні могуць узбагаціць працэс самаацэнкі.

Маладыя навучэнцы могуць падзяліцца сваёй самаацэнкай з іншымі і папрасіць даць каментары, прапановы і дадаць пункты, якія яны маглі прапусціць. Але, шчыра кажучы, самаацэнка - нялёгкая задача. Людзям цяжка вырашыць, якую каштоўнасць надаць уласным кампетэнцыям. Больш за тое, гэта не тое, да чаго яны прывыклі. Можа быць нязручна рабіць нататкі пра сябе, асабліва ў кантэксце Моладзевага пашпарту Youthpass, таму што Youthpass - гэта сертыфікат. Хутчэй за ўсё, людзі прывыклі да таго, што іх ацэньваюць іншыя, і радыя калі атрымліваюць станоўчую ацэнку. Напісаць штосьці станоўчае пра сябе, каб прадставіць свае навыкі іншым, можа здавацца крыху няёмкім, але гэта можна пераадолець. Людзі ў асяроддзі могуць адыграць у гэтым важную ролю.

# ДЫК ЯК ГЭТА РОБІЦЦА?

Самаацэнка - гэта не больш і не менш, чым здымак, зроблены ў нейкі момант у працэсе навучання, калі вучні знаходзяць хвіліну, каб убачыць свой прагрэс. Гэты момант можна падтрымаць пытаннямі ў фармаце ад першай асобы, напрыклад, «Куды я рухаюся?» Дзе я цяпер, у параўнанні з маімі першапачатковымі ўяўленнямі пра тое, што я хачу даведацца? Якога прагрэсу я дасягнуў? Што я магу зрабіць лепш? На што я здольны? Якое навучанне адбылося нечакана? Мае першапачатковыя ідэі ўсё яшчэ правільныя? Таксама: Ці на правільным я шляху? Якія новыя пытанні ў мяне ўзніклі? Якія мае наступныя крокі? Што варта адаптаваць?

Падчас самаацэнкі людзі падводзяць вынікі рэфлексіяў, якія яны рабілі раней. Хоць самаацэнка вельмі падобная на рэфлексію, у самаацэнцы людзі азіраюцца назад на пэўны перыяд або адрэзак дзейнасці, з дапамогай папярэдніх рэфлексіяўт ацэньваюць вынікі і каштоўнасць таго, што яны даведаліся, і выказваюць гэта словамі.

Як ужо гаварылася раней, вызначыць тое, што чалавек сапраўды даведаўся, няпроста. Гэта не тое, што чалавек «проста робіць». Безумоўна, некаторыя моманты вызначыць лягчэй: напрыклад, калі група зрабіла відэаролік падчас моладзевага абмену і выкарыстала пэўнае праграмнае забеспячэнне для яго рэдагавання, яны могуць адзначыць, што цяпер могуць выкарыстоўваць гэта праграмнае забеспячэнне. Тое ж самае, верагодна, тычыцца валанцёраў, якія апісваюць, як яны палепшылі свае моўныя навыкі падчас дзевяцімесячнага побыту ў іншай краіне. Аднак падчас моладзевага абмену або навучальнага курса і, вядома, падчас доўгага валанцёрства, маладыя людзі набываюць шмат інтэнсіўнага досведу. Якое з гэтага навучанне? Як яны могуць вызначыць і апісаць яго? Трэба азірнуцца на гэты досвед з дапамогай дзённіка і/або аднагодкаў, моладзевых працаўнікоў, трэнераў і ментараў, а таксама задаць сабе іншыя пытанні.

### Пытанні пра працэс навучання

Самаацэнка - гэта не толькі тое, ШТО вы даведаліся, але і ЯК. Гэта магчымасць падумаць пра тое, якія метады навучання лепш за ўсё падыходзяць для пэўнай асобы, якія праблемы трэба пераадолець, якая роля іншых людзей і ў які момант вы адчуваеце, што сапраўды вучыцеся. Гэтыя віды пытанняў дапамагаюць павысіць абазнанасць пра ўласнае навучанне і могуць дапамагчы адаптаваць спосаб навучання ў будучыні.

Здольнасць выказаць свой уласны стыль навучання словамі не толькі для сябе, але і для далейшага навучання, гэта таксама важны навык, які высока цэніцца, напрыклад, працадаўцамі. Нарэшце, гэта адна з ключавых кампетэнцыяў, вызначаных Еўрапейскай камісіяй: навучанне ўменню вучыцца. Веданне сябе як навучэнца з'яўляецца найважнейшым кампанентам гэтай кампетэнцыі.

## Пытанні аб новых ролях і задачах

Калі маладыя людзі прымаюць удзел у дзейнасці ў рамках еўрапейскай моладзевай праграмы, яны часта робяць тое, чаго не рабілі ніколі раней. Такія дзеянні, верагодна, вымагаюць шмат навучання, якое варта запісаць у самаацэнцы. Напрыклад, у ходзе валанцёрскага праекта малады валанцёр далучыўся да групы іншых валанцёраў, якія кожную сераду пасля абеду працавалі з групай падлеткаў - новы досвед, які прайшоў даволі добра. Што з гэтага вынес малады валанцёр? Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна вызначыць, якія задачы ён выконваў, напрыклад, прыдумваў ідэі для мерапрыемстваў, рыхтаваў мерапрыемствы, складаў бюджэт для мерапрыемстваў, рыхтаваў прастору, тлумачыў што адбудзецца групе, прыцягваў увагу групы, заахвочваў да ўдзелу дзяцей, якія не хацелі далучацца, вырашаў рознагалоссі ў групе, размаўляў з асобнымі дзецьмі, працаваў з іншымі валанцёрамі ў камандзе, вырашаў рознагалоссі з калегамі, напісаў справаздачу для арганізацыі і г.д. Адзначыўшы ўсе гэтыя элементы, валанцёр можа візуальна ўспомніць выкананне гэтых задач. Што было ў іх новага? Што валанцёру пасавала? Як яны ўдасканальваліся цягам месяцаў? Што дазваляла ім выконваць задачы добра?

Рэфлексія, якая вынікае з гэтых пытанняў, дазваляе маладым людзям сфармуляваць тое, што яны даведаліся падчас такой дзейнасці. Больш за тое, размова з іншымі валанцёрамі або ментарам пра адны і тыя ж пытанні, несумненна, дасць яшчэ лепшае разуменне, чым проста нататкі.

## Пытанні аб станоўчым досведзе

Часта тое, што людзі любяць рабіць, і тое, што дазваляе ім добра сябе адчуваць, не супадае з тым, што яны рабіць добра ўмеюць, і гэта цудоўна! Вельмі добра ўмець рабіць нешта, што рабіць зусім не падабаецца, напэўна, непажадана. Гэта можа дапамагчы падчас самаацэнкі. Вяртанне да сітуацыяў і дзейнасці, у якой удзельнік быў цалкам задаволеным і шчаслівым,

можа дапамагчы ім вызначыць кампетэнцыі, якія яны набылі. Па-першае, важна высветліць, што менавіта прымусіла іх адчуваць сябе добра; іншымі словамі, прааналізаваць, якія элементы складалі гэтую дзейнасць. Камусьці, хто любіць граць у музычным гурце, абавязкова спадабаецца граць на музычным інструменце. Але якія яшчэ ёсць кампаненты? Ігра ў гурце патрабуе ўменне працаваць у камандзе. Таму, магчыма, цесна супрацоўнічаць з іншымі - гэта тое, чым яны любяць займацца, і іх моцны бок. Хтосьці іншы, хто адчувае сябе шчаслівым пры арганізацыі дыскатэкі падчас моладзевага абмену, можа любіць танцаваць, але можа быць і шмат іншых элементаў, якія спрыяюць гэтаму радаснаму пачуццю і паказваюць, што ў гэтага чалавека ёсць пэўныя навыкі: быць добрым арганізатарам, клапаціцца пра людзей, ствараць добрую атмасферу, працаваць у камандзе і г.д. Такі аналіз дзейнасці можа спарадзіць новае ўяўленне пра свае захапленні і кампетэнцыі. Магчыма, справа не столькі ў самой дыскатэцы, колькі ў працы ў камандзе, якую хтосьці вельмі любіць і ўмее рабіць.

## Пытанні пра будучыню

Самаацэнка прадугледжвае агляд вынікаў пэўнай сітуацыі або перыяду. Таксама гэта магчымасць для навучэнца зірнуць у будучыню, сфарміраваць новыя планы і распрацаваць намеры. Зноў жа, трэба глядзець і на «як», і на «што», як часткі навучання. У якім навучанні хочацца ўдзельнічаць з гэтага моманту? Якія новыя спосабы навучання яшчэ трэба адкрыць – метады, якія могуць быць карыснымі? З якімі людзьмі вы хочаце звязацца падчас будучага працэсу навучання?

Акцэнт на «што» прадугледжвае цэлы шэраг новых пытанняў. У працэсе навучання можна знайсці адказы на пэўныя пытанні, але потым узнікае шмат новых пытанняў. Даследаванне пэўных прадметаў больш глыбока, хутчэй за ўсё, адкрые дзверы для новых і больш цікавых пытанняў. Аднак гэтыя пытанні таксама могуць узнікаць з уяўленняў пра сябе, напрыклад: як я магу выкарыстоўваць гэта ўсведамленне? Як я магу змяніць пэўныя паводзіны? Дзе я магу раскрыць свае нядаўна выяўленыя моцныя бакі? Праходжанне такой самаацэнкі дазваляе ўдзельнікам паглядзець наперад, скласці і сфармуляваць планы

# Пытанні для самаацэнкі

## БУДУЧЫНЯ

Якія спосабы навучання я хачу працягваць?

Якія новыя спосабы навучання я хачу паспрабаваць?

Якія новыя пытанні ўзніклі?

Як я магу сачыць за сваімі новымі высновамі?

## СПОСАБ НАВУЧАННЯ

Якое навучанне мне падыходзіць?

Што для мяне выклікі?

Якую ролю адыгрываюць іншыя людзі ў маім навучанні?

Якімі былі мае сапраўдныя моманты навучання?

## СТАНОЎЧЫ ДОСВЕД

Што дазволіла мне адчуваць сябе добра?

Што мне спадабалася?

Што гэта кажа пра мае кампетэнцыі?

## НОВЫЯ РОЛІ І ЗАДАЧЫ

Якія новыя ролі і задачы я ўзяў на сябе?

Якія розныя элементы былі ў гэтай задачы/ролі?

Якія новыя рэчы я даведаўся?

Што ў мяне добра атрымлівалася?

## САМААЦЭНКА Ў КАНТЭКСЦЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РАМКАХ ЕЎРАПЕЙСКАЙ МОЛАДЗЕВАЙ ПРАГРАМЫ

Разнастайнасць мерапрыемстваў у еўрапейскіх моладзевых праграмах таксама азначае і разнастайнасць самаацэнкі, хоць прынцыпы застаюцца такімі ж: вызначае вынікі навучання навучэнец.

Калі ментар завяршае трохдзённы навучальны семінар аб метадах ментарства, самаацэнка, верагодна, будзе карацейшай, чым у маладога валанцёра, які завяршае шасцімесячную праграму. Проста за шэсць месяцаў можна даведацца больш, чым за тры дні. Больш за тое, шасцімесячны працэс навучання ў іншай краіне і ў «іншым жыцці» будзе больш складаным, чым трохдзённая сесія па пэўнай тэме.

Ментару можа спатрэбіцца толькі некалькі нататак, зробленых на працягу курса і падчас рэфлексіі, і яму дастаткова будзе толькі паглядзець на праграму, каб успомніць розныя аспекты навучальнага курса і вызначыць вынікі навучання. Хоць нечаканае навучанне магло адбыцца дзякуючы пэўным сустрэчам або мерапрыемствам, асноўная ўвага надаецца тэме навучальнага курса, а менавіта метадам ментарства.

У шасцімесячным побыце фокус будзе не такі ясны, бо валанцёр меў велізарны спектр досведу, які меў навучальны патэнцыял. Гэты досвед не можа быць звязаны толькі з задачамі, якія выконваюцца на працы, ён таксама праходзіць на асабістым узроўні, уплываючы на ўпэўненасць валанцёра і яго самасвядомасць. Для выяўлення ўсіх гэтых вынікаў навучання важна на рэгулярнай аснове іх занатоўваць рознымі спосабамі. Самаацэнка па на такім доўгім перыядзе, запатрабуе значна больш часу і намаганняў, каб вылучыць усе розныя вынікі.

Ментару на самаацэнку спатрэбіцца ўсяго некалькі гадзін, а валанцёру, каб вызначыць вынікі навучання, значна больш часу. Яму давядзецца размаўляць з рознымі людзьмі ў арганізацыі, якая кіруе праектам, праглядзець усе іх нататкі і зверыць вынікі з калегамі-аднагодкамі і ментарам і г.д. Адсочваць вынікі вельмі важна!

# 2. РОЛЯ ФАСІЛІТАТАРА

Мы называем моладзевых працаўнікоў, ментараў, коўчаў і трэнераў фасілітатарамі (навучання). «Гартаючы Моладзевы пашпарт Youthpass» мае раздзел пад назвай «Роля фасілітатара», у якім апісваецца некалькі роляў фасілітатараў у працэсе Youthpass. У гэтым дапаможніку мы арыентуемся на чатыры з гэтых роляў, паколькі яны больш адносяцца да рэфлексіі і самаацэнкі:

- Уключыць навучанне ў парадак дня
- Бачыць патэнцыял навучэнцаў
- Задаваць дапаможныя пытанні
- Даваць зваротную сувязь

## УКЛЮЧЫЦЬ НАВУЧАННЕ Ў ПАРАДАК ДНЯ

Сувязь паміж моладзевымі праектамі і навучаннем не заўсёды відавочная. Для многіх маладых людзей навучанне адбываецца толькі ў школе – а для некаторых яно можа нават мець негатыўную канатацыю. Таму ёсць сэнс пабачыць навучанне з іншага пункту гледжання і пераасэнсаваць значэнне слова разам з маладымі ўдзельнікамі.

Адна з першых рэчаў, якія павінен зрабіць фасілітатар, гэта дабіцца яснасці ў пытанні мэтаў дзейнасці. У чым сэнс гэтага праекта? Што прапануе гэтая дзейнасць? Якое навучанне, на думку фасілітатара, у ім задзейнічанае? Як мы, як фасілітатары, разумеем сваю ролю? Які наш падыход да навучання? Робячы свае мэты і падыход відавочнымі, фасілітатары дапамагаюць маладым олюдзям распазнаваць магчымасці навучання. Гэта момант, калі навучанне ўключаецца ў парадак дня.

Калі справа даходзіць да рэфлексіі, асабліва важна, каб у праграме было дастаткова для гэтага часу і месца. Калі падчас моладзевага абмену няма пэўнага часу, адведзенага для рэфлексіі, і ўдзельнікі пакідаюць рэфлексію на вольны час, яе можа зусім не адбыцца. Акрамя вызначэння пэўнага часу, каб дапамагчы ўдзельнікам правесці рэфлексію, важна таксама прапанаваць інструменты, метады і пытанні. Забяспечваючы час, прастору і рэсурсы, фасілітатары падкрэсліваюць важнасць рэфлексіі ў рамках працэсу навучання. Больш за тое,

акрамя вызначэння часу для рэфлексіі, мае сэнс папрасіць маладых людзей падзяліцца сваім досведам правядзення рэфлексіі, абмеркаваць рэфлексію, калі можна так сказаць. Гэта можа гучаць крыху перабольшваннем, але, улічваючы, што для многіх маладых людзей рэгулярная рэфлексія - гэта нешта зусім новае, такое абмеркаванне дапамагае стварыць прастору для абмену думкамі, пераадолець праблемы, атрымаць парады і ідэі ад іншых. Такім чынам, навучанне заўсёды будзе на парадку дня.

## БАЧЫЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ НАВУЧЭНЦАЎ

Важна прызнаць, што для многіх маладых людзей рэфлексія і самаацэнка даюцца асабліва цяжка, таму што яны патрабуюць інтраспекцыі. Каб разважаць пра сябе і бачыць свае моцныя і слабыя бакі, трэба ўмець глядзець на сябе здалёк, не кажучы ўжо пра тое, як цяжка сказаць пра сябе: «У мяне гэта добра (ці не вельмі добра) атрымліваецца!»

Каментаванне таго, што вы назіраеце з пункту гледжання паводзін і ацэначных пазіцыяў, у якасці фасілітатара можа дапамагчы маладым людзям распазнаваць рэчы, пра якія яны не ведаюць ці не ўпэўненыя. Каментаванне патрабуе добрых навыкаў назірання, а таксама зваротная сувязь павінна быць апісальнай, а не выказваць стаўленне. Напрыклад, «Я думаю, што вы там адыгралі вядучую ролю», «Мне здалося, што вам вельмі спадабалася арганізоўваць гэтую дзейнасць», «У мяне ёсць адчуванне, што вам падабаецца рабіць значна больш, чым казаць» і г.д. - усё гэта спосабы пачаць размову пра кампетэнцыі – і асабліва пра ацэначныя пазіцыі – і гэта можа дапамагчы маладым людзям задумацца пра сябе і дасягнуць большай самасвядомасці.

Прызнанне патэнцыялу навучэнцаў таксама ўключае ў сябе распазнаванне розных спосабаў навучання і ўсведамленне таго, што ёсць больш чым адзін спосаб паспяхова вучыцца, і што кожны шлях дае розныя магчымасці. Гэта актуальна і для рэфлексіі. Для некаторых людзей сядзець самому і пісаць наогул не працуе. Яны могуць атрымаць значна больш карысці ад размовы з іншымі, магчыма, падчас прагулкі ці нават падчас сумеснага праслухоўвання музыкі. Як фасілітатар навучання, вы павінны дазваляць розныя спосабы і не раздражняцца, калі замест індывідуальнага запісвання, некаторыя ўдзельнікі пачынаюць рабіць нешта зусім іншае.

## ЗАДАВАЦЬ ДАПАМОЖНЫЯ ПЫТАННІ

Важна, каб да сеансу рэфлексіі быў гатовы набор пытанняў. Прыдумаць прыдатныя пытанні не заўсёды проста, асабліва калі трэба зрабіць гэта самастойна. Гэты дапаможнік змяшчае шмат прыкладаў пытанняў і метадаў правядзення апытання. Як фасілітатар навучання, вы маеце вырашальную ролю ў дапамозе маладым людзям з правядзеннем рэфлексіі, задаючы адпаведныя і дапаможныя пытанні. Вы глядзіце на рэчы пад іншым вуглом, таму вы можаце прапанаваць новыя для ўдзельнікаў пункты гледжання на іх дзеянні і паводзіны. Калі вы, дзякуючы сваёй тэхніцы апытання, прымушаеце людзей гаварыць пра сябе, вы дапамагаеце ім сфармуляваць тое, што яны перажылі, выканалі і даведаліся.

## ДАВАЦЬ ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ

Зваротная сувязь аналагічная працэсу фармулявання сваіх назіранняў, як апісана вышэй. Аднак «зваротная сувязь» у гэтым кантэксце адносіцца да арганізаванай і запланаванай дзейнасці, якую фасілітатар і ўдзельнік пагадзіліся правесці разам. Тут важна, каб чалавек, які атрымлівае зваротную сувязь, вырашаў, што гэта трэба зрабіць. Зваротная сувязь даецца не толькі агульна па ўсіх аспектах дзейнасці ўдзельніка: яна патрабуе ад удзельніка засяродзіцца на аспектах, якія ён выбірае.

Як той, хто дае зваротную сувязь, вы павінны прадумаць, на якія аспекты вы яе можаце даць. Калі валанцёр просіць зваротную сувязь пра тое, як ён працаваў з групай дзяцей, і вы як іх ментар, ніколі не бачылі валанцёра ў дзеянні, магчыма вы не той чалавек, якому варта гэта зрабіць.

Самы важны прынцып тут заключаецца ў тым, што зваротная сувязь павінна быць карыснай атрымальніку. Магчымасць нарэшце падзяліцца сваімі асабістымі меркаваннямі пра ўдзельніка - гэта не нагода для зваротнай сувязі. Майце на ўвазе, што калі вы хочаце, каб зваротная сувязь была формай падтрымкі ўдзельніка, яна заўсёды павінна быць са станоўчым намерам.

# 3. ІНФАРМАВАННЕ ПРА КАМПЕТЭНЦЫІ

Фармуляванне вынікаў навучання словамі карыснае, калі людзі хочуць расказаць пра свае кампетэнцыі іншым. Гэта таксама можа быць вельмі важна для саміх сябе. Працэс апісання ўласных здольнасцяў і кампетэнцыяў дапамагае развіваць сапраўднае ўсведамленне таго, што гэты чалавек здольны рабіць, і рабіць добра. У сваю чаргу, гэта дапамагае павысіць самасвядомасць і ўпэўненасць у сабе.

Для многіх маладых людзей глядзець у будучыню і вырашаць пра кірунак у жыцці даволі складаная задача. Якую працу яны хочуць? Што яны хочуць вывучыць? Усведамленне сваіх моцных бакоў і захапленняў можа быць надзвычай карысным для гэтага працэсу мыслення.

Для маладога прадпрымальніка вельмі важна ведаць, якія з яго асабістых моцных бакоў спатрэбяцца яму для стварэння бізнесу. Акрамя таго, пры прыняцці рашэння аб тым, з кім супрацоўнічаць, важна ўсведамляць, якіх кампетэнцыяў табе не хапае.

Здольнасць апісаць кампетэнцыі важная ў многіх сітуацыях, якія ўключаюць у сябе працу з іншымі людзьмі, таму што гэта спрыяе добрай каманднай працы. Гэта тычыцца каманд не толькі ў прафесійным кантэксце, але і ў валанцёрскіх праектах і ў асабістым жыцці. Здольнасць расказаць пра свой унёсак з'яўляецца жыццёва важным навыкам.



# III ЯК ПАДТРЫМАЦЬ САМААЦЭНКУ ДЛЯ МОЛАДЗЕВАГА ПАШПАРТУ YOUTHPASS

Аўтар Darko Marković

Ці будавалі вы калі-небудзь дом? Нават калі не, уявіце сабе на імгненне працэс яго стварэння. Гэта можа быць прыгожы дом вашай мары або проста бунгала. Уявіце сабе ўвесь працэс крок за крокам пачынаючы ад залівання падмуркаў, узвядзення вонкавых сцен, устаноўкі вокнаў і дзвераў, завяршэння ўсіх дробных працаў і ўкладкі чарапіцы на дах. Нешта пойдзе па першапачатковым плане, але ўзнікне і шмат нечаканых праблемаў. У рэшце рэштаў, дом завершаны, і вы хочаце сфатаграфаваць яго. Навошта вам здымак? Вы хочаце зрабіць здымак для сябе, захаваць у сваім прыватным альбоме? Альбо хочаце падзяліцца ім з

найбліжэйшымі сябрамі? Ці, магчыма, вы хочаце размясціць яго ў Інстаграме і падзяліцца ім з усім светам. У залежнасці ад сваіх намераў, вы будзеце шукаць найлепшы ракурс для здымка. Калі здымак прызначаны толькі для асабістага карыстання, гэта будзе прасцей, бо вы былі часткай працэсу, і вы ўжо ведаеце працэс знутры. Але які здымак перадасць іншым людзям усю прыгажосць і непаўторнасць гэтага дому?

Калі параўноўваць працэс Моладзевага пашпарту Youthpass, які прадугледжвае асабістую прыхільнасць да навучання і да пастаяннай рэфлексіі, з працэсам пабудовы дома, то момант, калі вы выпрацоўваеце сертыфікат Youthpass, эквівалентны моманту фатаграфавання гатовага дому з найлепшага ракурсу. Таму, перш чым вы пачнеце аказваць падтрымку ўдзельнікам, вам трэба зразумець, які ракурс яны шукаюць. Іншымі словамі, перш чым пачаць з маладымі людзьмі працэс самаацэнкі для моладзевага пашпарта Youthpass, было б добра запытаць сваіх удзельнікаў

«Для чаго вам патрэбны сертыфікат Youthpass і як вы хацелі б яго выкарыстоўваць?»

Відавочна, што на гэтыя пытанні можа быць шмат розных адказаў. У гэтым дапаможніку мы разгледзім некаторыя з найбольш частых адказаў, прадстаўленых у выглядзе чатырох ключавых слоў:

ДЛЯ СЯБЕ

ДЛЯ ПРАЦЫ

ДЛЯ ВАЛІДАЦЫІ

ДЛЯ АДУКАЦЫІ

## 1. «МНЕ ПАТРЭБНЫ МОЛАДЗЕВЫ ПАШПАРТ YOUTHPASS ДЛЯ СЯБЕ»

Калі адказ «Мне патрэбны Youthpass для сябе,» ваша роля ў працэсе самаацэнкі будзе значна менш сканцэнтравана на форме, чым на змесце. Навучэнцы маюць поўную свабоду апісваць вынікі навучання сваімі словамі.

Тут вы можаце засяродзіцца на:

- тлумачэнні працэсу самаацэнкі Youthpass і яго значэння,
- апісанні канцэпцыі ключавых кампетэнцыяў навучання на працягу ўсяго жыцця,
- прадстаўленні інструментаў падтрымкі для запісу вынікаў навучання,
- прадстаўленні пазітыўнай зваротнай сувязі,
- дапамозе па тэхнічных пытаннях атрымання сертыфіката.

Такая самаацэнка часта выконваецца ў дзённікавым стылі. У існуючых дапаможніках, звязаных з Моладзевым пашпартам Youthpass, пра самаацэнку «для сябе» гаворыцца шмат. У гэтым Дапаможніку мы хочам пайсці на крок далей і вывучыць, як падтрымаць удзельнікаў, якія працуюць над самаацэнкай, для іншых мэтаў, такіх як занятасць, далейшая адукацыя або валідацыя.

### ПРАПАНАВАНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ:

*Інструменты* Два бакі аднаго медаля, Шпаргалка, Злучэнне кропак, Сумоўе па выніках навучання, Піраміда навучання, Перанесці на новы ўзровень, Навучацца з эмоцыямі, Пакінуць ці прыбраць

## Зайвага

### ЗНАЧЭННЕ YOUTHPASS ДЛЯ САМААЦЭНКІ

Незалежна ад мэты, значэнне працы над сертыфікатам Youthpass можна падсумаваць наступным чынам:

1. Яна дае навучэнцам пачуццё завершанасці працэсу навучання, які яны прайшлі падчас праекту.

2. А таксама заслужанае прызнанне дасягненняў і кампетэнцыяў, атрыманых у праекце, самімі ўдзельнікамі.

3. Гэта выдатная магчымасць папрактыкаваць навыкі самаацэнкі, тым самым павышаючы агульную самасвядомасць навучэнцаў і развіваючы вельмі актуальныя навыкі, якія можна перанесці на іншыя сферы.

4. Калі працэс належным чынам падтрымліваецца фасілітатарам навучання або аднагодкамі, ён часта ўспрымаецца як пашырэнне магчымасцяў і вялікі імпульс да павышэння ва ўдзельнікаў упэўненасці ў сабе.

5. Гэта можа быць карысным у якасці асновы для пазнейшага апісання сваіх кампетэнцыяў іншым людзям.

# 2. САМААЦЭНКА Ў РАМКАХ МОЛАДЗЕВАГА ПАШПАРТУ YOUTHPASS:

## Ад асабістага выкарыстання да іншых мэтаў

Праца над самаацэнкай у рамках Моладзевага пашпарту YouthPass для іншых мэтаў (занятасць, адукацыя або валідацыя) будзе істотна адрозніваца ад працы над самаацэнкай выключна для сябе. Асноўная задача тут - вырабіць сертыфікат, які можа дапамагчы ў жыццёвым выбары або ў выбары кар'еры. Тады працэс падтрымкі можна абагульніць у наступных трох этапах:

Даследуйце

↓

Злучыце

↓

Дакажыце

### Даследуйце

- Даследуйце мэты і патрэбы ўдзельніка. Для чаго яны будуць выкарыстоўваць свой сертыфікат Моладзевага пашпарту Youthpass?
- Заахвочвайце іх даследаваць свае «мэты» (напрыклад, працу, працэдуру валідацыі або навучальную ўстанову), асабліва кампетэнцыі, якія гэтыя мэты патрабуюць.

## Злучыце

- Вызначце адпаведнасць паміж кампетэнцыямі, неабходнымі для мэты, і кампетэнцыямі, распрацаванымі ў праекце.
- Апісваючы кампетэнцыі, знайдзіце спосаб выкарыстоўваць мову, прыдатную і для мэтавай аўдыторыі, і для сферы моладзевай працы.

## Дакажыце

- Падтрымлівайце ўдзельнікаў у апісанні вынікаў свайго навучання, спасылаючыся на кампетэнцыі, неабходныя іх мэтавай аўдыторыі.
- Пераканайцеся, што маладыя людзі пацвярджаюць кожную пазіцыю фактамі (гэта могуць быць прыклады таго, як яны прадэманстравалі зададзеную кампетэнцыю падчас праекта).
- Праверце, ці асоба, якая менш знаёмыя з еўрапейскімі моладзевымі праграмамі, разумее мову тэксту.

У наступных раздзелах мы даем больш падрабязныя рэкамендацыі як падтрымаць працэс самаацэнкі ў рамках Моладзевага пашпарту Youthpass для шэрагу канкрэтных мэтаў, а менавіта для заяўкі на працу, паступлення на адукацыйную праграму або падрыхтоўкі да працэсу валідацыі.

## 3. «Я ПАДАЮ ЗАЯЎКУ НА ПРАЦУ»

Калі навучэнец мае намер выкарыстоўваць сертыфікат Моладзевага пашпарту Youthpass для падачы заяўкі на працу, неабходна зрабіць тры крокі, каб максімальна эфектыўна яго падтрымаць.

### ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ПЕРАНОСУ

Крок 1

- Пераканайцеся, што вучань разумее, што такое Моладзевы пашпарт Youthpass і чаго ад яго чакаць. Таксама ўдакладніце, чым Youthpass не з'яўляецца, а менавіта, што гэта не дакумент пра прысваенне кваліфікацыі і ці афіцыйнае пацвярджэнне набытых кампетэнцыяў.

- Растлумачце, як удзельнікі могуць пераносіць кампетэнцыі, атрыманыя ў адной вобласці ў іншую; напрыклад, з еўрапейскіх моладзевых праектаў у прафесійны кантэкст.

- Падкрэсліце патэнцыйныя перавагі выкарыстання Моладзевага пашпарту Youthpass у працэсе падачы заявак на працу, такія як:

a. Ён можа даць патэнцыйнаму працадаўцу дадатковую інфармацыю пра інтарэсы заяўніка і ўзроўні ініцыятыўнасці і актыўнасці.

b. Ён можа даць патэнцыйнаму працадаўцу інфармацыю аб кампетэнцыях, якія кандыдат набыў у іншым кантэксце.

c. Паколькі сертыфікат заснаваны на самаацэнцы, ён таксама можа дапамагчы скласці ўражанне пра ўзровень самасвядомасці заяўніка і яго здольнасць ацэньваць сябе збалансавана.

Пытанне

**ЦІ МОГУЦЬ КАМПЕТЭНЦЫІ, АТРЫМАНЫЯ Ў ЕЎРАПЕЙСКІХ МОЛАДЗЕВЫХ ПРАЕКТАХ, БЫЦЬ ПЕРАНЕСЕНЫЯ Ў ІНШЫЯ ПРАФЕСІЙНЫЯ СФЕРЫ?**

Як паказана ва ўводзінах да дадзенага Дапаможніка, з'яўляецца ўсё большая колькасць доказаў актуальнасці кампетэнцыяў, атрыманых у нефармальных умовах, і іх актуальнасці для патрабаванняў на рынку працы. У большасці выпадкаў гэтыя кампетэнцыі адносяцца да так званых скразных навыкаў (напрыклад, камунікатыўныя навыкі, арганізацыйныя навыкі, праца ў камандзе, самакіраванне, гнуткасць, адкрытасць да навучання, абазнанасць пра разнастайнасць і г.д.), многія з якіх развіваюць у еўрапейскіх моладзевых праектах. Аднак у некаторых выпадках удзельнікі таксама развіваюць вельмі актуальныя тэхнічныя кампетэнцыі, якія могуць быць перанесеныя ў іншыя прафесійныя кантэксты (напрыклад, навучальныя навыкі трэнера, навыкі па догляду за пажылымі людзьмі, навыкі будаўніцтва, лічбавыя кампетэнцыі, даследчыя навыкі і г.д.).

## УДАКЛАДНІЦЕ МЭТУ ПЕРАНОСУ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ

Крок 2

Пасля таго, як удзельнікі выпрацавалі разуменне Моладзевага пашпарту Youthpass і яго патэнцыйных выгадаў, настаў час пачаць працаваць над магчымасцю пераносу набытых навыкаў у іншыя сферы.

- Па-першае, удакладніце, ці патэнцыйная праца знаходзіцца ў моладзевым полі або ў зусім іншым прафесійным кантэксце. Перанесці навыкі, атрыманыя ў еўрапейскіх моладзевых праектах, будзе прасцей у падобны моладзевы (працоўны) кантэкст, чым у некаторыя іншыя сферы. Аднак існуюць праекты, асабліва ў міжнароднай валанцёрскай дзейнасці, дзе фактычная дзейнасць праекта адбываецца ў той жа прафесійнай сферы, што і патэнцыйны выбар кар'еры ўдзельніка. У гэтым выпадку перадача не абмяжоўваецца «трансверсальнымі кампетэнцыямі»; тэхнічныя кампетэнцыі аднолькава актуальныя.

## Ці можна пераносіць кампетэнцыі ўнутры моладзевай сферы або ў іншыя кантэксты?




- Прапанаваць навучэнцу даследаваць аналагічныя аб'явы пра працу ў інтэрнэце, каб высветліць, якія кампетэнцыі яны патрабуюць. Задача падвойная: скласці спіс усіх часта запатрабаваных кампетэнцыяў у мэтавай сферы і звярнуць увагу на мову, якая выкарыстоўваецца для іх апісання.

- Даследуйце сувязь паміж вынікамі навучання ў сваім цяперашнім еўрапейскім моладзевым праекце і кампетэнцыямі, згаданымі ў аб'явах. Далей паразважайце пра кампетэнцыі, атрыманыя падчас праекту. Ці ёсць супадзенні? Калі так, складзіце спіс найбольш распаўсюджаных кампетэнцыяў. Звярніце ўвагу, што гэты працэс можа прымусіць вас пабыць перакладчыкам, каб дапамагчы навучэнцу знайсці эквівалент кампетэнцыяў з абвестак пра вакансіі. Напрыклад, што ў кантэксце моладзевай працы з'яўляецца эквівалентам «арыентацыі на кліента» або «ўстойлівасці»?

Пытанне

ВЫ РАЗМАЎЛЯЕЦЕ НА МОВЕ ПРАЦАДАЎЦЫ?
НЕКАТОРЫЯ ТЫПОВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ, ЗГАДАНЫЯ Ў АБ'ЯВАХ ПРА ПРАЦУ:

Падсправаздачнасць, адаптыўнасць, увага да дэталяў, выразнае камунікаванне, упэўненасць, кіраванне канфліктамі, крэатыўнасць, развіццё іншых, эмацыйны кантроль, гнуткасць, уменне спраўляцца са стрэсам, цэласнасць, вядучая роля ў камандзе, адкрытасць да ідэяў, адкрытасць для навучання, праактыўнае мысленне, рашэнне праблемаў, кіраванне праектамі, арыентацыя на выніку, самакіраванне, ініцыятыўнасць, праца ў камандзе і г.д.

## КРОПКАВАЯ САМААЦЭНКА

Крок 3

Пасля таго, як спіс агульных кампетэнцыяў складзены, пачынаецца фактычная самаацэнка. Яна пачынаецца з пытання: «Якія кампетэнцыі са спісу вы распрацавалі падчас гэтага праекта?» Папрасіце ўдзельніка напісаць па адным кароткім абзацы пра кожную кампетэнцыю, пры гэтым дадаючы таксама, як праект дапамог ім развіць яго. Пры гэтым выконвайце наступныя рэкамендацыі:

a. Папрактыкуйцеся, стараючыся ўжываць «мову кампетэнцыяў» працадаўцы пры апісанні вынікаў навучання.

b. Пазбягайце выкарыстання моладзевага жаргону працы, які не будзе зразумелы працадаўцам з па-за вашай моладзевай сферы.

c. Абгрунтуйце свае сцвярджэнні. Прывядзіце канкрэтныя прыклады сітуацыяў у праекце, падчас якіх вы прадэманстравалі адпаведную кампетэнцыю.

Нарэшце, дапамажыце ўдзельніку скампанаваць сваю самаацэнку ў адпаведнасці з рамкамі ключавых кампетэнцыяў у сертыфікаце.

Зайвага

## САМААЦЭНКА YOUTHPASS ЯК СПОСАБ РАЗВІЦЦЯ НЕАБХОДНЫХ НАВЫКАЎ

Практыкуючы гэты від самаацэнкі – і пераадолеўшы разрыў паміж двума сусветамі – удзельнікі таксама развіваюць гнуткасць і адаптыўнасць, як вельмі адпаведныя навыкі пры пераносе кампетэнцыяў у іншы кантэкст.

У сербскім даследаванні* маладыя супрацоўнікі пацвердзілі магчымасць пераносу кампетэнцыяў, атрыманых у сферы моладзі і нефармальнага навучання, у іншую арганізацыйную культуру. Аднак яны таксама падкрэслілі, што такі перанос ніколі не быў аўтаматычным. Наадварот, тут патрабавалася значная асабістая гнуткасць і адаптыўнасць для прымянення сваіх кампетэнцыяў у іншым кантэксце.

Павышэнне абазнанасці пра ўласныя кампетэнцыі і здольнасць абгрунтаваць іх наяўнасць з'яўляюцца найважнейшымі навыкамі пры падачы заявак на працу. Яны павінны выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы суправаджальнага ліста, а таксама падчас сумоўя.

* Sever Džigurski and Darko Marković. Даследаванне ўплыву НФА на моладзевую працу (NAPOR, 2014)

## РАПАНАВАНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ:

Інструменты

Шпаргалка, Вам я патрэбны - я таго варты, Піраміда навучання, ГУЛЬНЯ З КАРТКАМІ: Назавіце свае кампетэнцыі, Пакажыце мне свае STARs, Праца мары.

## 4. «Я РЫХТУЮСЯ ДА ВАЛІДАЦЫІ МАІХ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ»

Некаторыя ўдзельнікі або валанцёры могуць захацець выкарыстаць свой Моладзевы пашпарт Youthpass у мэтах валідацыі. У выпадку, калі вы не ведаеце, што такое валідацыя: тэрмін азначае атрыманне афіцыйна прызнанай кваліфікацыі без праходжання фармальнай падрыхтоўкі або адукацыі ў гэтай сферы. Для валідацыі, заяўнік мусіць задакументаваць, што ён набыў неабходныя кампетэнцыі праз жыццёвы досвед і нефармальнае і інфармальнае навучанне. Ключавы чыннік для ўсіх працэсаў валідацыі, незалежна ад метадалогіі, - гэта прадстаўленне доказаў, каб абгрунтаваць адпаведныя сцвярджэнні. Часта патрабуецца стварыць партфоліа такіх доказаў і прадставіць яго на ацэнку. Калі ацэнка станоўчая, можна атрымаць поўную або частковую кваліфікацыю.[19]

### Валідацыя нефармальнага і інфармальнага навучання ў ЕС

Рэкамендацыя Еўрапейскага рады (2012 год) заклікае дзяржавы-чальцы не пазней за 2018 год увесці ў дзеянне дамоўленасці, якія дазваляюць заяўнікам ажыццяўляць валідацыю сваіх ведаў, навыкаў і кампетэнцыяў, набытых з дапамогай нефармальнага і інфармальнага навучання. Для дасягнення гэтай мэты, усё большая колькасць еўрапейскіх краінаў распрацоўвае сістэмы валідацыі. Варта пашукаць актуальную інфармацыю адносна правілаў, якія прымяняюцца для валідацыі ў вашым кантэксце. Гэта можна зрабіць, звярнуўшыся да Еўрапейскага рэестру па валідацыі, які рэгулярна абнаўляецца.

Звычайна поўны працэс валідацыі ўключае ў сябе наступныя чатыры этапы:

1. ВЫЯЎЛЕННЕ вынікаў навучання заяўніка, атрыманых праз нефармальнае і інфармальнае навучанне;
2. ДАКУМЕНТАЦЫЯ вынікаў навучання заяўніка, атрыманых праз нефармальнае і інфармальнае навучанне;
3. АЦЭНКА вынікаў навучання заяўніка, атрыманых праз нефармальнае і інфармальнае навучанне;
4. СЕРТЫФІКАЦЫЯ вынікаў ацэнкі вынікаў навучання заяўніка, атрыманых праз нефармальнае і інфармальнае навучанне, у выглядзе прысваення кваліфікацыі, або крэдытаў, якія прыводзяць да кваліфікацыі, або ў іншай форме, па меры неабходнасці.

Нягледзячы на тое, што схема Youthpass першапачаткова не мела намеру служыць мэтам афіцыйнага прызнання (валідацыі) кампетэнцыяў або кваліфікацый, яна можа ўнесці свой унёсак як мінімум двума спосабамі:

1. Сертыфікат Youthpass у якасці доказу мусіць быць уключаны ў партфоліа для праверкі;

2. Працэс самаацэнкі Youthpass развівае практыку рэфлексіўнага пісьма і абгрунтавання сваіх заяваў, дэманструючы кампетэнцыі, развітыя ў дзейнасці.

[19] Еўрапейскія рэкамендацыі па валідацыі нефармальнага і інфармальнага навучання http://www.cedefop.europa.eu/en/publications-and-resources/publications/3073 і Еўрапейскі рэестр па валідацыі:: http://www.cedefop.europa.eu/en/events-and-projects/projects/validation-non-formal-and-informal-learning/european-inventory

## КАБ ПАДТРЫМАЦЬ УДЗЕЛЬНІКАЎ, ЯКІЯ РАЗГЛЯДАЮЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ВЫКАРЫСТАННЯ YOUTHPASS ДЛЯ ВАЛІДАЦЫІ, ВЫ МОЖАЦЕ ЗРАБІЦЬ НАСТУПНАЕ:

Крок 1

Папрасіце іх старанна вывучыць працэс валідацыі і яго патрабаванні. У прыватнасці, яны павінны высветліць, якія кампетэнцыі неабходныя для жаданай кваліфікацыі і якія доказы прымаюцца.

Крок 2

Ацаніце актуальнасць дзейнасці ў рамках еўрапейскай моладзевай праграмы для жаданай кваліфікацыі. Праверце, у якой ступені жаданыя кампетэнцыі былі распрацаваны праз дзейнасць.

Крок 3

Пасля ўстанаўлення адпаведнасці паміж неабходнымі і развітымі кампетэнцыямі папрасіце ўдзельнікаў завяршыць працэс самаацэнкі для рэлевантных кампетэнцыяў. Важна не толькі сцвярджаць, што ўдзельнікі развівалі гэтую кампетэнцыю падчас праекту, але і падтрымаць гэтае сцверджанне. Заахвочвайце ўдзельнікаў выкарыстоўваць сваю самаацэнку Youthpass для практыкі абгрунтавання прэтэнзій для валідацыі. Якія доказы яны могуць прадставіць, каб пацвердзіць, што яны набылі пэўную кампетэнцыю?

Кампетэнцыі, распрацаваныя падчас еўрапейскага моладзевага праекта

Кампетэнцыі, неабходныя для кваліфікацыі




Якія ў вас ёсць доказы, што вы развілі гэтыя кампетэнцыі ў рамках праекту?

Крок 4

Папрасіце ўдзельнікаў разглядзець магчымасць уключэння іх сертыфіката моладзевага пашпарту Youthpass у якасці доказаў у сваім партфоліа для праверкі альбо проста скапіяваць элементы іх самаацэнкі Youthpass, альбо і тое, і другое. Удзельнікі павінны планаваць свае далейшыя крокі ў працэсе валідацыі.

## ПРАПАНАВАНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ:

Інструменты

Шпаргалка, Інтэрв'ю па выніках навучання, Піраміда навучання, Пакажыце мне свае STARs

## 5. «Я ХАЧУ ПРАЦЯГНУЦЬ АДУКАЦЫЮ І НАВУЧАННЕ»

Часам былы валанцёр або ўдзельнік можа мець намер выкарыстаць сертыфікат Youthpass пры паступленні на курс, які вядзе да атрымання ступені або на праграму фармальнай падрыхтоўкі. Нагоды для гэтага могуць вар'іравацца ў залежнасці ад сітуацыі: напрыклад, каб атрымаць дадатковыя балы за валанцёрства, прызнаць папярэдні досвед і навучанне, каб прапусціць некаторыя часткі вучэбнай праграмы, альбо выкарыстаць сертыфікат Youthpass у якасці доказу кампетэнцыі ў замежнай мове замест афіцыйнага сертыфіката ацэнкі валодання мовай пры паступленні ва ўніверсітэт у іншай краіне. Тым не менш, калі гаворка ідзе пра далейшую адукацыю, удзельнікі павінны запытаць у школы/універсітэта/правайдэра прафесійнай падрыхтоўкі, ці магчыма акрэдытацыя папярэдняга эксперыментальнага навучання (APEL) і якія доказы патрэбныя. Пасля атрымання дакладнай інфармацыі, вы можаце працягнуць працу і падтрымаць удзельніка, як апісана ў двух папярэдніх раздзелах.

### ПРАПАНАВАНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ:

Інструменты

Шпаргалка, Вам я патрэбны - я таго варты, Піраміда навучання, ГУЛЬНЯ З КАРТКАМІ: Назавіце свае кампетэнцыі, Пакажыце мне свае STARs, Праца мары



# Прыклады стыляў самаацэнкі:

## I Стыль дзённіка

### АПІСАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ

Адзін з падыходаў навучэнцаў еўрапейскіх моладзевых праграмаў да самаацэнкі ў рамках Моладзевага пашпарту Youthpass - выкарыстанне «мовы дзённіка», што азначае апісанне мерапрыемстваў, у якіх яны бралі ўдзел, з абмежаванай спасылкай на развіццё кампетэнцыяў. Мова дзённіка часта напоўненая жаргонам, характэрным для праекту. Хоць гэты стыль цалкам падыходзіць для асабістага выкарыстання, ён мае вельмі абмежаваную каштоўнасць, калі гаворка ідзе пра выкарыстанне Моладзевага пашпарту Youthpass па-за кантэкстам міжнароднай працы з моладдзю.

*Прыклад*

«Мы працавалі разам у групах. Я прыдумаў ідэі, і разам з іншымі мы развілі іх. Я шмат працаваў для сваёй групы і ў сваёй групе, і я стараўся прытрымлівацца інструкцыяў, каб атрымаць добры вынік. Робячы прэзентацыі на замежнай мове».

## II Стыль рэзюмэ

### ПЕРАЛІК КАМПЕТЭНЦЫЯЎ

Іншы падыход, які часта выкарыстоўваецца ў сертыфікатах Youthpass, - гэта проста пералік нядаўна распрацаваных кампетэнцыяў без абгрунтавання. Гэта добрая аснова для выкарыстання Youthpass, але патрабуе дадатковай працы, каб зрабіць такі сертыфікат больш даступным і пераканаўчым для кагосьці са «знешняга свету».

*Прыклад*

«Я навучыўся ператвараць ідэі ў дзеянні. Я навучыўся быць творчым і інавацыйным. Я даведаўся, што я павінен быць смелым у прыняцці рызыкаў, і даведаўся больш пра кіраванне праектамі.»

# Прыклады стыляў самаацэнкі:

## III Пераканаўчы стыль

### НАЗЫВАННЕ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ І АБГРУНТАВАННЕ

Для павышэння дастасавальнасці сертыфікатаў Моладзевага пашпарту Youthpass і магчымасці пераносу кампетэнцыяў, атрыманых у праекце, рэкамендуецца выразна назваць атрыманую кампетэнцыю (з выкарыстаннем мовы «мэты») і абгрунтаваць (г.зн., прадставіць канкрэтныя прыклады таго, як прымяненне гэтай кампетэнцыі на практыцы прывяло да станоўчага выніку). Ніжэй прыведзены прыклад фармату STAR20 для абгрунтавання. Гэтая методыка таксама можа выкарыстоўвацца для інфармавання пра свае кампетэнцыі ў рэзюмэ, суправаджальных лістах або падчас сумоўя.

Прыклад

«Падчас праекта я палепшыў сваю гнуткасць пры працы ў камандзе. Два месяцы я працаваў з камандай з васьмі маладых людзей, якія планавалі лакальны праект кампаніі. Раптам з-за скарачэння фінансавання некаторыя з нашых першапачатковых ідэяў ужо не маглі рэалізавацца, таму нам трэба было ўсё перапланаваць. Хоць я асабіста быў вельмі прывязаны да пэўных першапачатковых ідэяў, я пагадзіўся аб'яднаць некаторыя запланаваныя мерапрыемствы і адмовіцца ад іншых, захоўваючы пры гэтым галоўную мэту кампаніі. Сітуацыя прывяла да большага адзінства каманды, а потым і да паспяховай кампаніі».

Падыход STAR падыходзіць для выкарыстання не толькі пры апісанні паспяховых сітуацыяў – ён таксама можа прымяняцца да сітуацыяў, звязаных з няўдачай, калі ў выніку чалавек даведаўся альбо зразумеў у гэтай сітуацыі нешта істотнае. Гэта дазваляе навучэнцам прадэманстраваць адкрытасць да навучання і прыхільнасць да самаразвіцця.

[2] Interview Skills Consulting Ltd. Гід па паспяховым інтэрв'ю (2003-2016). STAR а і аналагічныя падыходы, якія выкарыстоўваюцца ў інтэрв'ю на аснове кампетэнцыяў пры прыёме на працу.




Апішыце сітуацыю (situation), калі вы прадэманстравалі або засвоілі кампетэнцыю, якую прадстаўляеце.

Якія задачы (tasks) вы мусілі выканаць у гэтай сітуацыі; якія канкрэтныя праблемы вам давялося вырашаць.

Якія дзеянні (actions) вы распачалі для выканання гэтых задач і як вы справіліся з гэтымі праблемамі.

Якія былі вынікі (results) вашых дзеянняў; што вы даведаліся з гэтай сітуацыі.

Фармат STAR для абгрунтавання вашых кампетэнцыяў



# IV ІНСТРУМЕНТЫ І ПАРАДЫ ДЛЯ САМААЦЭНЬВАННЯ І АПІСАННЯ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ

Уладанне Anita Silva

> «У тэорыі, тэорыя і практыка аднолькавыя,
> але на практыцы яны вельмі адрозніваюцца»
>
> Звычайна прыпісваецца Ёгі Бэры

Ведаць тое, што ведаеш, няпроста. Мы ўжо гэта зразумелі. Напісаць тое, што ведаеш, можа быць яшчэ больш складана, асабліва калі чалавек, скажам,

- малады;
- не прызвычаены да апісання ўласных кампетэнцыяў;
- мусіць пісаць пра іх замест таго, каб проста прадэманстраваць іх;
- канкрэтна пра гэта не быў папярэджаны.

Складана, праўда? Для атрымання кароткага, але поўнага апісання патрабуюцца добрыя навыкі пісьма (ніхто не хоча чытаць раман пра нечыя кампетэнцыі). Апісанне павінна быць рэалістычным, але і пераканаўчым. Хіба гэта не тое самае, што прасіць удзельніка мець аналітычную здольнасць Фрэйда і пісьмовыя здольнасці Толкіна?

Хоць гэта і няпроста, але мы верым, што маладыя людзі на такое здольныя. Але спачатку ім можа спатрэбіцца крыху дапамогі. На шчасце, гэта першапачатковая мэта моладзевай працы - падтрымка маладых людзей у іх развіцці - і мы сур'ёзна верым у патэнцыял моладзі.

Таму пытанне на мільён еўра:

**Як вы ў якасці моладзевага працаўніка, трэнера або ментара падтрымліваеце навучэнцаў у тым, каб стаць больш абазнанымі пра вынікі свайго навучання і зрабіць яго больш заўважным для іншых праз Моладзевы пашпарт Youthpass?**

Усё ў дадзеным раздзеле - пра гэтыя способы. Мы сабралі некаторыя практычныя ідэі пра тое, як вы можаце падтрымаць удзельнікаў або моладзевыя групы ў напісанні пераканаўчай самаацэнкі і пацешна прабавіць час, робячы гэта. У гэтым раздзеле змяшчаюцца пакрокавыя апісанні інтэрактыўных метадаў, распрацаваных з мэтай дапамагчы вам пазнаёміць удзельнікаў з – для некаторых, страшным - светам напісання самаацэнкі, адначасова паглыбляючы ўласную рэфлексію і працягваючы ўдасканальваць свае навыкі пісьма. Тут таксама прапануюцца парады і падказкі, каб зрабіць вашу працу як фасілітатара больш зладжанай і эфектыўнай. Нарэшце, мы прапануем розныя віды рэсурсаў, якім можна выкарыстоўваць у гэтым працэсе.

Вядома, эфектыўнасць гэтых інструментаў шмат у чым залежыць ад таго, як вы іх прымяняеце. Вы павінны разважаць пра тое, якія ў вас і ўдзельнікаў мэты і што вы хочаце дасягнуць, і адаптаваць інструменты, якія дапамогуць вам і ім атрымаць жаданыя вынікі. Для гэтага важна ўлічваць узрост і папярэдні досвед вашых удзельнікаў, а таксама час і прастору, якія вы выдзяляеце для падтрымкі іх у напісанні сваёй самаацэнкі.

Кожнае практыкаванне мае на мэце дапамагчы навучэнцам адкрыць новыя способы тлумачэння сваіх набытых кампетэнцыяў. Гэта азначае, што часам вам давядзецца папрасіць удзельнікаў засяродзіцца на адной канкрэтнай кампетэнцыі або канкрэтным досведзе навучання і выкарыстоўваць гэта ў якасці асновы для самога практыкавання.

Гатовыя? Тады паехалі!

## 1. МЕТАДЫ

1. ДВА БАКІ АДНАГО МЕДАЛЮ
2. ШПАРГАЛКА
3. ЗЛУЧЭННЕ КРОПАК
4. ВАМ Я ПАТРЭБНЫ - Я ТАГО ВАРТЫ
5. ІНТЭРВ ‘Ю ПРА ВЫНІКІ НАВУЧАННЯ
6. ПІРАМІДА НАВУЧАННЯ
7. ГУЛЬНЯ З КАРТКАМІ:
   НАЗАВІЦЕ СВАЕ КАМПЕТЭНЦЫІ
8. ПАКАЖЫЦЕ МНЕ СВАЕ STARS
9. ПРАЦА МАРЫ
10. ТРЫ КРЭСЛЫ МАЙГО НАВУЧАННЯ
11. ПЕРАНЕСЬЦІ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ
12. НАВУЧАЦЦА З ЭМОЦЫЯМІ
13. ПАКІНУЦЬ ЦІ ПРЫБРАЦЬ?



# 1. ДВА БАКІ АДНАГО МЕДАЛЮ

Тое, што ведаюць удзельнікі, з'яўляецца вельмі важным. Але ці вы разумееце: тое, чаго яны не ведаюць, таксама вельмі каштоўнае? Напрыклад, працадаўцы заўсёды шукаюць тое, што робіць кандыдата асаблівым. Адзін са спосабаў вырашыць гэта - вывучыць моцныя і слабыя бакі кандыдатаў падчас сумоўя на працу. Ці гатовыя вашы навучэнцы тлумачыць свае ўласныя абмежаванні асэнсаваным спосабам? Гэта практыкаванне можа дапамагчы.

## ПАМЕР ГРУПЫ

Любы

## ПРАЦЯГЛАСЦЬ

20-40 хвілінаў

## РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Папяровыя манеты (гл. раздатак)
- Асадкі

## МЭТЫ

- Дапамагчы ўдзельнікам сфармуляваць тое, чаму яны навучыліся, і якія кампетэнцыі ім яшчэ трэба развіваць
- Асэнсаваць важнасць прызнання таго, чаго яны не ведаюць

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Вынікі навучання падобныя на два бакі аднаго медалю. На ўсё, чаму мы навучыліся, знойдзецца штосьці нязведанае. Усведамляць тое, чаго мы не ведаем - гэта выдатны спосаб адкрыць новыя сцяжыны навучання і выклікаць цікаўнасць; і гэта важна, калі мы хочам працягваць вучыцца. Мэта дадзенага практыкавання - дапамагчы ўдзельнікам зрабіць гэта.

## ІНСТРУКЦЫЯ

- Дайце па адной папяровай манеце кожнаму ўдзельніку і папрасіце з аднаго боку напісаць тое, што ён даведаўся.
- Растлумачце на гэтай стадыі, што пазней яны абмяркуюць напісанае і па сканчэнні змогуць пакінуць сабе манеты.
- Як толькі яны закончаць, папрасіце іх напісаць на другім баку медаля сказ, які пачынаецца з «Аднак», дзе апісваецца нешта актуальнае, чаму яны яшчэ не навучыліся або што трэба палепшыць. Прыклад: бок 1 - я даведаўся пра інстытуты ЕС; бок 2 - аднак мне ўсё яшчэ цікава даведацца больш пра тое, як узаемадзейнічаюць розныя інстытуты.
- Раздайце яшчэ па дзве манеты кожнаму ўдзельніку. Папрасіце іх зрабіць тое ж самае на гэтых дадатковых манетах, пазначыўшы іншыя рэчы, якім яны навучыліся на баку 1, і звязаныя з імі выклікі на баку 2.
- Нарэшце, папрасіце ўдзельнікаў прачытаць тое, што яны напісалі.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Рэальныя манеты маюць грашовую вартасць. Ці, на вашу думку, напісаныя рэчы маюць вартасць?
- Які бок больш каштоўны? Бок 1 ці 2? Чаму?
- Ці важна думаць пра тое, чаго мы яшчэ не ведаем? Чаму?
- Ці ёсць выразы на вашых манетах, якія вы хацелі б выкарыстаць у Моладзевым пашпарце Youthpass?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

### Ідэі для адаптацыі

- Калі некаторым удзельнікам цяжка бачыць або пісаць, вы можаце выкарыстоўваць рэальныя манеты. Проста раздайце манеты і папрасіце іх памацаць адзін бок манеты. Потым скажыце ім, што вынікі навучання падобныя на манеты, таму што яны маюць пэўную вартасць. Папрасіце

іх распавесці пра адну рэч, якой яны навучыліся. Пасля папрасіце іх памацаць іншы бок. Кажучы пра іншы бок, папрасіце іх падзяліцца тым, што яны яшчэ не ведаюць пра згаданую раней тэму. Вы можаце занатоўваць тое, што яны кажуць. Падчас падвядзення вынікаў можна зачытаць свае нататкі ім і спытаць, ці хочуць яны ўключыць што-небудзь з гэтага ў сваю самаацэнку.

## Парады і падказкі

- Калі ў вас ёсць час, вы можаце папрасіць удзельнікаў запісаць, як яны могуць развіваць гэтую кампетэнцыю далей. Прыклад: бок 1 = Я навучыўся занатоўваць вынікі ўласнай рэфлексіі; бок 2 = Тым не менш, мне ўсё яшчэ трэба развіваць гэты навык далей. Я магу прайсці курс крэатыўнага пісьма, каб быць больш упэўненым у сабе і палепшыць свае навыкі пісьма.

- Вы таксама можаце прапанаваць неадкладна перанесці гэтыя кароткія сказы на самаацэнку, выбіраючы тую графу кампетэнцыі, якая найлепшым чынам адпавядае

## Рызыкі, цяжкасці і г.д.

Удзельнікі могуць адчуваць сябе няўпэўнена, пішучы пра рэчы, якія яны яшчэ не спазналі, або пра якія не маюць упэўненасці. Таму важна:

- Абавязкова запэўніце іх, што гэта нармальна задаваць пытанні і прызнаваць тое, чаго яны не ведаюць. Падчас працэсу вы можаце запоўніць уласную манету і падзяліцца з імі сваімі вынікамі і патрэбамі ў навучанні.
- Напрыканцы не збірайце назад манеты. Ставіцеся да іх як да асабістых матэрыялаў, як да дзённіка, які яны мусяць захоўваць для сябе.

### РАСПРАЦОЎКА:

Anita Silva


Я навучыўся
BYN


Я навучыўся
BYN


Я навучыўся
BYN


Я навучыўся
BYN

# 2. ШПАРГАЛКА

Памятаеце, як вы сядзелі на экзамене з маленькімі шпаргалачкамі ў кішэні з інфармацыяй, неабходнай для гэтага экзамену? Вядома, што не памятаеце! Гэта называецца махлярствам, і вы б ніколі гэтага не зрабілі! ;) Гэта, тым не менш, шпаргалка, якая дапамагае ўдзельнікам знайсці правільныя словы, каб запісаць зграбнымі поўнымі сказамі тое, што яны ўжо ведаюць. Час на махлярства!

Калі ж сур'ёзна: часам шпаргалкі - добры спосаб вывучыць, і тут ідэя палягае ў тым, каб даць удзельнікам некалькі простых словаў, якія могуць дапамагчы ім пачаць выказваць тое, чаму яны ўжо навучыліся. Або, калі яны ўжо ведаюць, якія кампетэнцыі яны набылі, гэта можа дапамагчы ім зафіксаваць іх, выкарыстоўваючы больш выразную трапную мову.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Любы

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

30 хвілінаў

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Папера
- Асадкі
- Фліпчарт, дошка ці нешта падобнае або копіі шпаргалкі

### МЭТЫ

- Дапамагчы ўдзельнікам сфармуляваць вынікі свайго навучання ў пісьмовай форме.

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1

- На фліпчарце або шпаргалцы для кожнага чалавека (гл. табліцу ніжэй), напішыце словы ў розных формах, каб дапамагчы ўдзельнікам будаваць свае сказы.

Крок 2

- Пакажыце на фліпчарце (або раздайце шпаргалкі) і растлумачце ўдзельнікам: «Вы ведаеце, што навучыліся пэўным рэчам, але «навучанне»- гэта слова, якое часам абмяжоўвае вашы варыянты. Гэты фліпчарт дапаможа вам даследаваць іншыя аспекты вашага досведу навучання».

Крок 3

- Потым папрасіце ўдзельнікаў напісаць поўныя сказы пра ўласныя вынікі навучання, выкарыстоўваючы дзеясловы і выразы з табліцы.

Крок 4

- Кожны слупок у табліцы - гэта асобны аркуш. Гэта азначае, што ўдзельнікі могуць выкарыстоўваць першы выраз у 1-м слупку і злучыць яго з 3-м выразам у 2-м слупку і 5-м выразам у 3-м слупку.

Прыклад: «Я даследаваў прыняцце групавых рашэнняў у рамках міжнароднай групы маладых людзей на працягу трохдзённага летніка. Мы мусілі ўсё вырашаць разам, і мы навучыліся рабіць гэта без спрэчак. Гэта дазволіць мне ў будучыні быць лепшым чальцом каманды».

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- У вас атрымалася напісаць некалькі сказаў пра вынікі навучання?
- Ці ў гэтым працэсе вам дапамагла табліца? Як менавіта яна вам дапамагла?
- Па вашых адчуваннях, ці гэтая фраза выразна апісвае вынікі вашага навучання?
- Ці ёсць у гэтай табліцы словы або выразы, якія вы можаце выкарыстоўваць для разгляду іншых вынікаў навучання?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Для некаторых удзельнікаў словы ў табліцы могуць быць новымі. Калі гэта так, выдзеліце час, каб растлумачыць іх значэнне, перш чым пачаць практыкаванне.
Відавочна, што вы можаце адаптаваць табліцу пад сваю мову і выбіраць іншыя словы, якія маюць больш сэнсу ў вашым кантэксце.

## АДАПТАЦЫЯ

Anita Silva



## Шпаргалка

Я даследаваў...
Я абмеркаваў...
Я распазнаў...
Я паставіў пад пытанне...
Мне не ўдалося...
Я пацешыўся...
Я паразважаў...
Я пераканаўся...
Я адкрыў для сябе...
Я прачытаў...
Я адчуў...
Я марыў...
Я чуў...
Я сутыкнуўся з...

Таму што...
Праз дзеянне...
Разам з...
Без...
У той час як...
Пры гэтым...
Калі...
Датычна...
Праз...
Пасля...
Калі...
Нягледзячы на...
Той факт, што...

Гэта актуальна для...
Гэта дазволіць мне...
Гэта праявіцца ў...
Гэта будзе карысным для...
Гэта створыць для мяне магчымасць...
Гэта паказала мне...
Гэта зматывавала мяне...
Гэта мяне спыніла...
Дзякуючы гэтаму мне стала ясна...
Гэта змяніла...
Гэтым павялічылася...
Гэта палепшыла...
Дзякуючы гэтаму выявілася, што...
Гэта стварыла...

# 3. ЗЛУЧЭННЕ КРОПАК

Пры напісанні самаацэнкі некалькі дзён ці тыдняў пасля досведу навучання, памяць пра гэты досвед, безумоўна, расцярушыцца. Каб нагадаць важныя элементы гэтага досведу, выкарыстанне групавой памяці можа быць карысным. Мэта гэтага практыкавання - дапамагчы ўдзельнікам дапамагаць адзін аднаму ў згадванні дэталяў іх навучальнага досведу, якія могуць быць карыснымі пры напісанні самаацэнкі.

## ПАМЕР ГРУПЫ

Ад трох да дванаццаці

## ПРАЦЯГЛАСЦЬ

прыбл. 40 хвілінаў
(у залежнасці ад памеру групы)

## РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Вялікі плакат або рулон паперы
- Асадкі
- Маркеры

## МЭТЫ

- Дазволіць удзельнікам выкарыстоўваць словы і ўспаміны адзін аднаго, каб асэнсаваць пэўны досвед навучання (напрыклад, моладзевы абмен).

- Падрыхтуйце вялікі пусты плакат для групы і дайце па адной асадцы кожнаму ўдзельніку. Асадкі павінны быць рознага колеру. Крок 1

- Папрасіце ўдзельнікаў напісаць ключавыя словы недзе на плакаце, падчас кожнага з раўнду, як гэта апісана ніжэй. Адвядзіце ад двух да чатырох хвілін на адзін раўнд. Крок 2

- Падчас першага раўнду папрасіце іх запісаць словы, звязаныя з тэмамі, пра якія яны даведаліся ў рамках гэтага канкрэтнага досведу навучання (напрыклад, праца ў камандзе, талерантнасць, крэатыўнасць...). Крок 3

- Падчас другога раўнду папрасіце іх запісаць словы, праз што яны прайшлі, напрыклад, практыкаванні або рэчы, якія яны спрабавалі (напрыклад, гатаванне ежы разам, катанне на конях, гульні...). Крок 4

- Падчас 3-га тура папрасіце іх запісаць словы пра тое, чаму яны рэальна навучыліся (праца ў шматкультурнай камандзе, стрыманасць, палепшаная англійская мова...). Заўвага: Вы можаце скараціць або павялічыць колькасць раўндаў, каб ахапіць, напрыклад, «рэчы, якія змяніліся ў вас», «рэчы, якія вы прапусцілі» і г.д. Як фасілітатар дапамагайце ўдзельнікам запамінаць розныя моманты працэсу (падрыхтоўчыя сесіі перад выездам, падчас практыкаванняў, падчас перапынкаў і г.д.). Крок 5

- Пасля апошняга раўнду папрасіце ўдзельнікаў злучыць розныя словы (свае ці чужыя) на плакаце, стварыўшы лабірынт або намаляваўшы лінію з уласным выдзяленнем. Кожны ўдзельнік павінен выбраць на плакаце любыя словы, якія, на яго думку, маюць дачыненне да яго навучальнай сцяжыны, нават калі гэтыя словы былі напісаныя кімсьці іншым. Яны могуць злучаць словы як заўгодна, калі гэта мае для іх сэнс. Крок 6

- Пасля гэтага папрасіце кожнага ўдзельніка выкарыстоўваць словы, якія яны злучылі разам у пісьмовым тэксце, які мусіць быць напісаным на асобным аркушы паперы. Дайце 15-20 хвілін на гэты крок. Крок 7

- Як варыянт, вы можаце папрасіць маладых людзей прачытаць свае тэксты ўслых або выкарыстоўваць плакат у якасці крыніцы натхнення для стварэння свайго Моладзевага пашпарту Youthpass. Крок 8

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Як гэта было - згадваць успаміны з вашага навучальнага досведу?
- Ці магчымасць выкарыстаць словы іншых Вам была карыснай?
- Калі вы глядзіце зараз на свой тэксту, якія ў вас пачуцці да гэтага досведу навучання?
- Што вы можаце выкарыстоўваць з гэтага тэксту для вашага Моладзевага пашпарту Youthpass?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Калі ўдзельнікі маюць праблемы з напісаннем, замест таго, каб папрасіць іх напісаць словы, якія адносяцца да іх досведу навучання, вы можаце даць ім калоду картак з ключавымі словамі і папрасіць іх выбраць з прапанаванага або напісаць новыя карткі. Напрыканцы, замест таго, каб кожны ўдзельнік пісаў уласны тэкст, вы можаце папрасіць іх расказаць пра карткі, якія яны палічылі адпаведнымі, пакуль вы робіце нататкі ад іх імя. Пасля таго, як яны адчуюць сябе больш упэўненымі ў сваіх высновах, дапамажыце ім напісаць свой тэкст.

## РАСПРАЦОЎКА

Anita Silva


teamwork
CREATIVITY
Tolerance
cooking together
HORSE RIDING
playing games
WORKING IN MULTICULTURAL TEAMS
Speaking better English
being patient

# 4. ВАМ Я ПАТРЭБНЫ – Я ТАГО ВАРТЫ

Нават калі людзі ведаюць, чаму яны навучыліся, часам цяжка ўявіць, якую каштоўнасць могуць мець веды ці навыкі для іншых. Гэта практыкаванне запрашае ўдзельнікаў паглядзець на рэчы з гледзішча працадаўцы або будучага калегі і ўявіць, як яны ацэняць атрыманыя ўдзельнікамі кампетэнцыі.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Любы

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

30 хвілінаў

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Дзённікі навучання
- Асадкі і папера

### МЭТЫ

- Прызнаць каштоўнасць таго, чаму навучыліся ўдзельнікі, каб яны маглі зрабіць самаацэнку, якую іншыя захочуць прачытаць і ацаніць

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Папрасіце ўдзельнікаў выбраць кампетэнцыю, якую яны атрымалі ў сваім праекце, і завяршыць адзін або некалькі наступных сказаў:

- Арганізацыя/кампанія можа выкарыстаць маю кампетэнцыю ў ... таму што гэта палепшыць іх...
- Я буду каштоўным чальцом каманды, бо цяпер я магу...
- Мне будуць плаціць, каб я... таму што мой працадаўца будзе выйграваць...
- Я змагу вучыцца...таму што я ўжо ведаю/магу...
- Я буду лепшым грамадзянінам, бо... і гэта карысна для...

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Якую каштоўнасць для іншых мае твая нядаўна набытая кампетэнтнасць?
- Як вы можаце гэта выказаць, калі пішаш свой Моладзевы пашпарт Youthpath?
- Як вы можаце паказаць доказы гэтай кампетэнцыі?
- Ці можаце вы прывесці прыклад сітуацыі, калі вы яе выкарыстоўвалі?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Можна сфармуляваць іншыя сказы, калі яны лепш адпавядаюць кантэкстам вашых удзельнікаў. Калі ёсць складанасці, каб пісаць, практыкаванне можа выконвацца і ў вуснай форме.

## РАСПРАЦОЎКА

Anita Silva

# 5. ІНТЭРВ'Ю ПРА ДОСВЕД НАВУЧАННЯ

Часам добрая размова - гэта ўсё, што трэба, каб растлумачыць свае ідэі. Гэты метад дазваляе ўдзельнікам вербалізаваць важныя аспекты свайго навучання.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Тры і больш

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

90 хвілін

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Папера
- Асадкі
- Гід па правядзенні інтэрв'ю

### МЭТЫ

- Аказаць дапамогу навучэнцам у фармуляванні вынікаў свайго навучання
- Падзяліцца і абмяняцца вынікамі навучання

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1

• Патлумачце, што не ўсе пытанні з гайду? павінны быць выкарыстанымі. Роля гэтых пытанняў - натхніць інтэрв'юера і толькі прапанаваць магчымыя пытанні, калі гэта неабходна. Інтэрв'юер можа дадаць іншыя пытанні, калі палічыць патрэбным.

Крок 2

• У кожным інтэрв'ю задзейнічаныя трое ўдзельнікаў, кожны з якіх мае адрозную ролю: інтэрв'юера, асобы, якая дае інтэрв'ю і рэпарцёра. Падчас практыкавання кожны ўдзельнік мае магчымасць памяняць ролі. Рэпарцёр запісвае вынікі інтэрв'ю такім чынам, каб суразмоўца мог выкарыстоўваць гэтыя нататкі ў якасці асновы для запісу вынікаў навучання.

• Адно інтэрв'ю займае каля 20 хвілін.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

• Як гэта было - выконваць розныя ролі (інтэрв'юера, асобы, якая дае інтэрв'ю, рэпарцёра)?
• Якія ў вас пачуцці пасля артыкулявання зараз вынікаў свайго навучання?

## РАСПРАЦОЎКА

Paul Kloosterman

## ДАДАТКІ (НАПРЫКЛАД, РАЗДАТКІ)

### Пытанні інтэрв'ю пра вынікі навучання

Інтэрв'ю па выніках навучання



**ЯКІЯ МОМАНТЫ ВАМ ВЕЛЬМІ СПАДАБАЛІСЯ ПАДЧАС ПРАЕКТУ?**

- Вы можаце апісаць гэты(я) момант(ы)?
- Што абумовіла асаблівасць гэтага моманту(-аў)?
- Якая была ваша роля ў той момант?
- Што вы рабілі?
- Што гэта кажа пра вас?

**КАЛІ ВЫ ПРАЦАВАЎ КАМАНДЗЕ...**

- Што вам спадабалася?
- Што ў вас добра атрымлівалася?
- Якім быў ваш унёсак у каманду?
- Якія ролі вы выконвалі?
- Вы лічыце сябе камандным гульцом? Чаму?
- Калі б ваша каманда была экіпажам карабля, кім бы вы былі? Кухарам, капітанам, матросам, штурманам...?
- Што гэта кажа пра вас?

**КАЛІ ВЫ САПРАЎДЫ ГАНАРЫЛІСЯ САБОЙ?**

- Што адбылося?
- Якую ролю вы ўзялі на сябе?
- Што вы зрабілі?
- Што дазволіла мець добрыя пачуцці?
- Што гэта кажа пра вас?



# Інтэрв'ю па выніках навучання

ЯКІЯ РЭЧЫ Ў ГЭТЫМ ПРАЕКЦЕ ВЫ НІКОЛІ НЕ РАБІЛІ РАНЕЙ?

- Як гэта прайшло?
- Якія былі адчуванні?
- Вы здзівілі самога сябе?
- Вы зробіце гэтыя рэчы зноў?
- Калі так, дык вы штосьці зрабілі б інакш?
- Што гэта кажа пра вас?

ШТО ВЫ БУДЗЕЦЕ РАБІЦЬ ЗАРАЗ, КАЛІ ПРАЕКТ СКОНЧВАЕЦЦА?

- Ёсць новыя рэчы, якія вы хочаце паспрабаваць?
- Над якімі пытаннямі вы хочаце працягваць працаваць?
- Што вы перанесеце з праекта на іншыя месцы працы?
- Што вы даведаліся пра сябе?
- Што гэта кажа пра вас?

ЯКІЯ БЫЛІ СКЛАДАНЫЯ МОМАНТЫ?

- Можаце апісаць гэтыя моманты?
- Што зрабіла іх складанымі для вас?
- Як вы пераадолелі гэтыя выклікі?
- Азіраючыся назад, Вы зрабілі б тое ж самае зноў?
- Што гэта кажа пра вас?

ШТО Б ВЫ СКАЗАЛІ ПРА СВАЮ РОЛЮ Ў ПРАЕКЦЕ...

- ... вашай бабулі?
- ... вашай старой настаўніцы пачатковай школы?
- ... мясніку?
- ... вашаму трохгадоваму пляменніку?
- ... калі б у вас бралі інтэрв'ю па нацыянальным тэлебачанні?

# 6. ПІРАМІДА НАВУЧАННЯ

Гэты інструмент дапамагае ўдзельнікам арганізаваць сваё навучанне па ўзроўнях і сфармуляваць сказы, выкарыстоўваючы спіс дзеясловаў.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Для індывідуальнай працы з адным удзельнікам або для групы, падзеленай на пары

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

90-120 хвілін

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Аркушы паперы для фліпчарту
- Маркеры
- Раздатак са словамі дзеяння

### МЭТЫ

- Вызначыць вынікі навучання паводле перагледжанай таксаноміі вынікаў навучання Блума
- Навучыцца фармуляваць вынікі навучання з дапамогай прапанаванага спісу дзеясловаў

### АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Гэта практыкаванне заснаванае на таксаноміі вынікаў навучання Блума і дапамагае ўдзельнікам высветліць, на якім узроўні іх вынікі навучання пасля праекту, і знайсці адпаведныя словы для іх апісання.

У адпаведнасці з мадэллю існуе шэсць узроўняў навучання (гл. дыяграму ніжэй). Для кожнага ўзроўню прапануюцца «дзеясловы», якія могуць быць выкарыстаныя для апісання вынікаў навучання (гл. раздатак з дзеясловамі дзеяння).



Перагледжаная таксанамія вынікаў навучання Блума

Пасля вызначэння некалькіх ключавых кірункаў навучання ў праекце (напрыклад, з выкарыстаннем іншых практыкаванняў, такіх як ГУЛЬНЯ З КАРТКАМІ «Назавіце свае кампетэнцыі» або інтэрв'ю пра вынікі навучання), намалюйце піраміду навучання Блума на аркушы для фліпчарту і растлумачыць яе ўзроўні[21]

[21] Дадатковая інфармацыя пра перагледжаную таксанамію Блума даступная тут: https://cft.vanderbilt.edu/guides-sub-pages/blooms-taxonomy/ або http://www.celt.iastate.edu/teaching/effective-teaching-practices/revised-blooms-taxonomy/

### Згадванне

Растлумачце, што гэты этап - гэта магчымасць згадаць досвед і/або аднавіць інфармацыю (напрыклад, я прачытаў і запомніў асноўную інфармацыю пра этапы развіцця каманды).

Узровень 1

### Разуменне

Гэты этап апісвае здольнасць прадэманстраваць больш глыбокае разуменне сферы свайго навучання (напрыклад, я магу распазнаць этапы развіцця каманды ў нашай камандзе падчас навучання).

Узровень 2

Прымяненне

Узровень 3

Гэты этап звязаны з прымяненнем ведаў у рэальнай жыццёвай сітуацыі (напрыклад, я магу прымяніць і выкарыстоўваць свае веды пра этапы развіцця каманды ў маёй камандзе і дапамагчы нам прайсці праз гэтыя этапы планавым і свядомым спосабам).

Аналіз

Узровень 4

Гэты этап прадугледжвае атрыманне больш глыбокага разумення сферы навучання, як правіла, дзякуючы пашыранай рэфлексіі пра яго досвед (напрыклад, я магу дакладна прааналізаваць прычыны праблемаў, з якімі сутыкаецца мая каманда пры запуску новага праекту. Я магу распазнаць мадэлі нашых паводзін, якія рухаюць нас наперад або блакуюць нас).

Ацэньванне

Узровень 5

Гэты этап звязаны з крытычнымі разважаннямі і здольнасцю аргументаваць плюсы і мінусы пэўнага падыходу на аснове свайго досведу (напрыклад, я магу разважаць і разумець, чаму этапы развіцця каманды ў міжнародных групах не абавязкова маюць тую ж паслядоўнасць і працягласць, што і ў маёй мясцовай камандзе).

Стварэнне

Узровень 6

Гаворка ідзе пра стварэнне чагосьці новага, уласнай тэорыі або падыходу (напрыклад, на аснове майго досведу я ствараю новыя спосабы, як дапамагчы міжнародным камандам лепш працаваць).

Цяпер папрасіце ўдзельнікаў вярнуцца да ўласных вынікаў навучання і згрупаваць іх у адпаведнасці з вышэйпералічанымі этапамі. Калі вы карыстаецеся карткамі, вы можаце папрасіць іх размясціць карткі там, дзе яны лічаць адбывалася іх навучанне. Як варыянт, папрасіце іх намаляваць злучальныя лініі альбо запісаць свае асноўныя вынікі навучання на малюнку піраміды.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

Пасля таго, як яны размясцілі вынікі навучання на пірамідзе, папрасіце ўдзельнікаў растлумачыць свой выбар. Вы можаце задаваць пытанні адносна характарыстык кожнага ўзроўню, напрыклад:

- Якая самая важная інфармацыя і веды, якія вы можаце аднавіць у гэтай сферы навучання?
- Як вы можаце прадэманстраваць больш глыбокае разуменне тут? Можаце прывесці прыклад?
- Ці можаце вы быць больш канкрэтнымі адносна вашай здольнасці прымяняць тое, чаму вы навучыліся? Ці можаце вы прымяніць гэтую здольнасць у іншых сітуацыях?
- Можаце прывесці прыклад добрага аналізу, які вы зрабіў у гэтай сферы?
- Якія вашы ўражанні ад крытычнага мыслення ў сувязі з гэтай сферай навучання?
- Што ў вас атрымалася стварыць у сувязі з гэтай сферай навучання? Як у вас атрымалася гэта зрабіць?

Пасля гэтага кроку раздайце раздрукоўку з дзеясловамі дзеяння і формулай для напісання справаздач пра вынікі навучання (для атрымання дадатковай інфармацыі гл. раздзел III.4 «Я рыхтуюся да валідацыі») і дайце ўдзельнікам зрабіць практыкаванне наконт усіх сфераў навучання, пра якія вы казалі. У выпадку патрэбы, зрабіце дадатковыя тлумачэнні.

Выразны дзеяслоў «дзеяння» + звязаны прадмет навучання + кантэкст, у якім навучанне было атрыманым. = Справаздача пра вынікі навучання

## АДАПТАЦЫЯ

Darko Marković

## УЗРОВЕНЬ 1. ЗАПОМНІЦЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Выбраць | Намаляваць | Размясціць | Прапусціць | Прачытаць | Паўтарыць |
| Палічыць | Ідэнтыфікаваць | Суаднесці | Акрэсліць контуры | Згадаць | Аднавіць |
| Акрэсліць | Ахарактарызаваць | Запомніць | Пазначыць | Расказаць на памяць | Выбраць |
| Апісаць | Пералічыць | Назваць | Працытаваць | Распазнаць | Выкласці |

## УЗРОВЕНЬ 2. ЗРАЗУМЕЦЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Атаясаміць | Абмеркаваць | Экстрапаляваць | Інтэрпрэтаваць | Прадставіць | Расказаць |
| Класіфікаваць | Адрозніць | Абагульніць | Суаднесці | Перафармуляваць | Трансляваць |
| Апрацаваць | Вылічыць | Даваць прыклады | Зрабіць | Перапісаць | |
| Ператварыць | Патлумачыць | Ілюстраваць | Суджэнне | Выбраць | |
| Абараніць | Выказаць | Абазначыць | Парафразаваць | Паказаць | |
| Прадэманстраваць | Пашырыць | Заключыць | Прадказаць | Падсумаваць | |

## УЗРОВЕНЬ 3. ПРЫМЯНІЦЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Дадаць | Класіфікаваць | Зрабіць інсцэніроўку | Унесці ўстаўку | Арганізаваць | Паказаць |
| Прымяніць | Дапоўніць | Разгледзець | Вынесці суджэнне | Апісаць у фарбах | Схематызаваць |
| Падлічыць | Вылічыць | Растлумачыць | Маніпуляваць | Падрыхтаваць | Вырашыць |
| Змяніць | Адкрыць | Абагульніць | Мадыфікаваць | Выпрадукаваць | Вылічыць |
| Выбраць | Разбіць на часткі | Графічна прадставіць | Прыводзіць у дзеянне | Зрабіць селекцыю | Выкарыстаць |

## УЗРОВЕНЬ 4. АНАЛІЗАВАЦЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Аналізаваць | Камбінаваць | Развіваць | Праводзіць адрозненні | Абазначаць | Аддзяляць |
| Размясціць | Параўноўваць | Прадстаўляць у выглядзе дыяграмы | Ідэнтыфікаваць | Акцэнтаваць увагу | Падразбіваць |
| Разбіць | Праектаваць | Дыферэнцыяваць | Ілюстраваць | Суадносіць | Рабіць агляд |
| Катэгарызаваць | Выяўляць | | Заключаць | Рабіць селекцыю | Ужываць |
| Класіфікаваць | | | | | |

## УЗРОВЕНЬ 5. АЦАНІЦЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Даваць ацэнку вартасці | Параўноўваць | Крытыкаваць | Вызначаць | Апраўдваць | Расцэньваць |
| Ацэньваць | Рабіць выснову | Крытычна ацэньваць | Атэставаць | Вымяраць | Падтрымліваць |
| | Супастаўляць | Абараняць | Судзіць | Ранжыраваць | Правяраць |

## УЗРОВЕНЬ 6. СТВАРАЦЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Выбіраць | Праектаваць | Тлумачыць | Вынаходзіць | Выпрадукоўваць | Перапісваць |
| Камбінаваць | Развіваць | Фармуляваць | Выпрацоўваць | Прапаноўваць | Гуляць па ролях |
| Зводзіць разам | Прыдумляць | Генераваць | Арганізаваць | Пераразмяшчаць | Расказваць |
| Складаць | Рабіць | Дзяліць на групы | Спараджаць | Перабудоўваць | Трансфармаваць |
| Будаваць | Весці ў пэўным кірунку | Рабіць гіпотэзы | Планаваць | Рэарганізоўваць | |
| Ствараць | | Інтэграваць | Прадпісваць | Пераглядаць | |

# 7. ГУЛЬНЯ З КАРТКАМІ: Назавіце сваю кампетэнцыю

Калі пісаць пра досвед навучання становіцца праблемай, дапамажыце ўдзельнікам назваць свае кампетэнцыі і спрасціць працэс самаацэнкі.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Для індывідуальнай працы з адным удзельнікам або для групы, падзеленай на пары

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

60-90 хвілін

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Адзін набор картак з кампетэнцыямі на кожнага ўдзельніка (гл. раздатак), ідэальна - таксама паўтораныя на кардонках

### OBJECTIVES

- Дапамагчы распазнаць і назваць кампетэнцыі, развітыя падчас праекту
- Забяспечыць аснову для дакументавання вынікаў навучання ў сертыфікаце Моладзевага пашпарту Youthpass

### АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Версія 1

Раскладзіце ўсе карткі з калоды на стол, каб надпісы з кампетэнцыямі былі бачныя. Папрасіце ўдзельніка задумацца над нефармальнай навучальнай дзейнасцю (або праектам у сферы працы з моладдзю), у якой яны ўзялі ўдзел, і выбраць карткі, якія абазначаюць кампетэнцыі, распрацаваныя падчас дзейнасці. Калі некаторыя кампетэнцыі адсутнічаюць, яны могуць выкарыстоўваць карткі-»джокеры» (пустыя) карткі і ўпісаць там іншыя кампетэнцыі.

Версія 2

Дайце ўдзельніку ўсю калоду картак і папрасіце іх раскласці на тры стосы: «развітыя падчас праекту», «неразвітыя падчас праекту» і «не маю пэўнасці». Калі гэта будзе зроблена, спачатку праверце стос «не маю пэўнасці», каб убачыць, ці ёсць кампетэнцыя, якую варта змясціць у групу «развітых падчас праекту». Пасля паглядзіце на гэты стос картак і спраўдзіце, ці не адсутнічае важная кампетэнцыя (тая, якой не было ў калодзе). Калі так, выкарыстоўвайце пустыя карткі, каб дадаць іх.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

Пасля таго, як карткі будуць адсартаваныя, папрасіце ўдзельніка задумацца над інтэрпрэтацыяй кожнай кампетэнцыі і згадаць моманты ці сітуацыі, калі яны развілі гэтую кампетэнцыю або калі яна ўпершыню праявілася. Рабіце нататкі і аддайце іх удзельніку напрыканцы практыкавання.

Гэта практыкаванне можа працягваць разам з практыкаваннямі «Пакажыце мне свае STARs» або «Пірамідкі навучання» з дадзенага дапаможніка.

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Раздатак «Карткі кампетэнцыяў» павінен быць таксама скапіяваным на аркушы ў большым фармаце (напрыклад, А3), у ідэале на кардоне. Гэта дазволіць вам стварыць сапраўдную калоду картак.

## РАСПРАЦОЎКА

Darko Marković

## ДАДАТКОВЫЯ КРЫНІЦЫ, СПАСЫЛКІ І МАТЭРЫЯЛЫ

Калі вы аддаяце перавагу гатовым калодам картак, якія можна выкарыстоўваць для той жа мэты, іх можна набыць у інтэрнэце ў розных пастаўшчыкоў, напрыклад, http://www.kwaliteitenspel.nl/en/

| | | | |
|---|---|---|---|
| ПАДСПРАВАЗ-ДАЧНАСЦЬ | РАЗВІЦЦЁ ІНШЫХ | НЭТВОРКІНГ | БУДАВАННЕ СТАСУНКАЎ |
| ДАКЛАДНАЯ САМААЦЭНКА | ЭМПАТЫЯ | ЛІКАВЫЯ РАЗВАГІ | ПРЫНЯЦЦЁ РЫЗЫКОЎНЫХ РАШЭННЯЎ |
| СФАКУСАВАНАСЦЬ НА ДАСЯГНЕННІ ВЫНІКУ | ГНУТКАСЦЬ | ШЫРЫНЯ ПОГЛЯДАЎ | САМАСВЯДОМАСЦЬ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| АДАПТАВАЛЬНАСЦЬ | ЗДОЛЬНАСЦЬ ДАВАЦЬ /АТРЫМЛІВАЦЬ ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ | АДКРЫТАСЦЬ ДА НАВУЧАННЯ | УПЭЎНЕНАСЦЬ У САБЕ |
| ЗДОЛЬНАСЦЬ АНАЛІТЫЧНА МЫСЛІЦЬ | НАВЫКІ Ў ІКТ | ВУСНАЕ КАМУНІКАВАННЕ | ТСТАНОЎЧАЕ ЎСВЕДАМЛЕННЕ РАЗНАСТАЙНАСЦІ |
| АРТЫСТЫЧНАЕ ВЫКАЗВАННЕ | ЗДОЛЬНАСЦЬ УПЛЫВАЦЬ | НА ІНШЫХ АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ АБАЗНАНАСЦЬ | СТРАТЭГІЧНАЕ МЫСЛЕННЕ |
| УВАЖЛІВАСЦЬ ДА ДЭТАЛЯЎ | ЦЭЛАСНАСЦЬ | АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ НАВЫКІ | КІРАВАННЕ СТРЭСАМ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| АЎТАНОМНАСЦЬ | МІЖКУЛЬТУРНАЯ АДЧУВАЛЬНАСЦЬ | НАСТОЙЛІВАСЦЬ | ПРАЯЎЛЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ |
| АРЫЕНТАВАНАСЦЬ НА КЛІЕНТА | ЛІДАРСКІЯ НАВЫКІ | ПЛАНАВАННЕ | ЗДОЛЬНАСЦЬ БРАЦЬ АДКАЗНАСЦЬ |
| ДБАННЕ ПРА ЯКАСЦЬ | АКТЫЎНАЕ СЛУХАННЕ | ПАЛІТЫЧНАЯ ПІСЬМЕННАСЦЬ | НАВЫКІ ДА НАВУЧАННЯ І ВЫКЛАДАННЯ |
| КІРАВАННЕ КАНФЛІКТАМІ | КІРАВАННЕ БЮДЖЭТАМ | НАВЫКІ ПРЭЗЕНТАЦЫІ | КАМАНДНАЯ ПРАЦА |

| | | | |
|---|---|---|---|
| КРЭАТЫЎНАСЦЬ | КІРАВАННЕ УЛАСНЫМІ ЭМОЦЫЯМІ | ЗДОЛЬНАСЦЬ ВЫЗНАЧАЦЬ ПРЫЯРЫТЭТЫ | КІРАВАННЕ ЧАСАМ |
| КРЫТЫЧНАЕ МЫСЛЕННЕ | КІРАВАННЕ УЛАСНЫМ НАВУЧАННЕМ | АКТЫЎНАЯ ПАЗІЦЫЯ | ЦЯРПІМАСЦЬ ДА ДВАІСТАСЦІ |
| ЗДОЛЬНАСЦЬ СПРАЎЛЯЦЦА СА ЗМЕНАМІ | ЗДОЛЬНАСЦЬ МАТЫВАВАЦЬ ІНШЫХ | ЗДОЛЬНАЦЬ ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМЫ | ЗДОЛЬНАСЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ПАД ЦІСКАМ |
| ЗДОЛЬНАСЦЬ ПРЫМАЦЬ РАШЭННІ | ЗДОЛЬНАСЦЬ ВЕСЦІ ПЕРАМОВЫ | КІРАВАННЕ ПРАЕКТАМІ | ЗДОЛЬНАСЦЬ ПІСЬМОВАГА КАМУНІКАВАННЯ |

# 8. ПАКАЖЫЦЕ МНЕ СВАЕ STARS

Як можна даказаць, што нешта ведаеш? Адзначце «зорачкай», каб паказаць, якія задачы, дзеянні і вынікі вы разглядалі ў дадзенай навучальнай сітуацыі.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Індывідуальная праца або праца ў групе любых памераў

### DURATION

90-120 хвілін

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Раздатак Мадэль STAR

### МЭТЫ

- Аказваць дапамогу ў дакументаванні вынікаў навучання ў фармаце, зразумелым працадаўцам
- Практыкаваць навыкі погляду з іншай перспектывы (бачыць рэчы з гледзішча працадаўцы)
- Палепшыць навыкі самапрэзентацыі пры правядзенні інтэрв'ю

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1

Растлумачце ўдзельнікам, што ў гэтым практыкаванні яны вучацца прадстаўляць кампетэнцыі, атрыманыя ў рамках праекту (напрыклад, якія яны выявілі ў іншых практыкаваннях, такіх як Назавіце свае кампетэнцыі, Інтэрв'ю пра вынікамі навучання, Шпаргалка і г.д.) у фармаце, які звычайна выкарыстоўваецца пры падачы заявы на працу. Асноўная мэта гэтага практыкавання - прадставіць кампетэнцыі з доказамі (канкрэтнымі прыкладамі), якія могуць быць выкарыстаныя не толькі для сертыфікатаў Моладзевага пашпарту Youthpass, але і ў рэзюмэ (раздзел навыкаў і кампетэнцыяў), у іх суправаджальных або матывацыйных лістах, а таксама падчас сумоўя на працу.

Крок 2

Растлумачце ўдзельнікам, што пры пошуку працы ў рэальным жыцці важна пачаць з абвесткі пра вакансію і ўважліва паглядзець на неабходныя навыкі/кампетэнцыі (звычайна гэта навыкі камунікавання, праца ў камандзе, праца пад ціскам, рашэнне праблемаў і г.д.). Такім чынам, гэта практыкаванне дапаможа ім не толькі запоўніць сваю самаацэнку для Моладзевага пашпарту YouthPass, але і палепшыць іх здольнасць прадставіць сябе ў добрым святле пры пошуках працы.

Крок 3

Далей растлумачце, што ў працэсе набору працадаўцы вельмі часта выкарыстоўваюць так званы кампетэнтнасны падыход (таксама вядомы як «паводзінавае сумоўе»), каб найлепш суаднесці вашы кампетэнцыі і кампетэнцыямі, якія патрабуе праца. Працадаўцы будуць пытацца, ці могуць кандыдаты прадставіць доказы сваіх заяваў; іншымі словамі, яны просяць іх прывесці прыклады канкрэтных сітуацыяў, калі тыя прадэманстравалі або развілі канкрэтныя кампетэнцыі (напрыклад, «Калі ласка, апішыце сітуацыю, калі вы паспяхова працавалі ў камандзе. Або раскажыце мне пра сітуацыю, калі вам трэба было кіраваць сваімі прыярытэтамі і гэта добра атрымалася»). Важна мець на ўвазе, што большасць працадаўцаў вельмі мала ведаюць пра моладзевую працу. Рэкамендуйце мінімізаваць выкарыстанне жаргону і заўсёды задаваць сабе пытанне, ці зразумее тое, што яны пішуць, хтосьці, хто ніколі не займаўся моладзевым абменам або валанцёрствам у рамках еўрапейскай моладзевай праграмы, або хто ніколі не чуў пра моладзевую працу.

Крок 4

Нарэшце, раздайце ўдзельнікам раздатак пра мадэль STAR і папрасіце іх напісаць кароткі абзац пра кожную кампетэнцыю, якую, на іх думку, яны развілі падчас праекту.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Як гэта было - працаваць з мадэллю STAR?
- У якой ступені вам удалося глядзець з перспектывы працадаўцы?
- Наколькі зразумелыя вашы апісанні асобе, якая не мае досведу працы з моладдзю?
- Як можна палепшыць гэтыя апісанні?
- Як гэтыя кампетэнцыі найлепшым чынам адпавядаюць рамкам ключавых кампетэнцыяў у самаацэнцы для Моладзевага пашпарту Youthpass?
- У якой ступені вы можаце выкарыстоўваць падыход STAR падчас сумоўя на працу?

## АДАПТАЦЫЯ

Darko Marković

## ДАДАТКОВЫЯ КРЫНІЦЫ, СПАСЫЛКІ І МАТЭРЫЯЛЫ

У Інтэрнэце ёсць шмат матэрыялаў і рэсурсаў пра мадэль STAR.

# Мадэль STAR

## Сітуацыя:

Апішыце сітуацыю, у якой вы набылі/прадэманстравалі дадзеную кампетэнцыю.

## ЗАдачы:

Якія задачы вы павінны былі выканаць у гэтай сітуацыі?

## Дзеянні:

Якія дзеянні вы прадпрынялі?

## Вынікі:

Якія былі вынікі?

# 9. ПРАЦА МАРЫ

Паглядзеўшы на сваю будучыню, вы зможаце лепш зразумець, што вы хочаце зрабіць ці сказаць сёння. Гэты інструмент дапамагае ўдзельнікам стварыць бачанне для сябе і зразумець, дзе знаходзіцца іх праект у сувязі з гэтай марай.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Для індывідуальнай працы з адным удзельнікам або для групы, падзеленай на пары

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

60-90 хвілін

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

Для гэтага практыкавання вам трэба зручнае месца і нешта, чым напісаць. Рабіце нататкі за вашага ўдзельніка падчас практыкавання (дзе паказана), якімі вы падзяліцеся з ім напрыканцы.

### МЭТЫ

- Інфармаваць пра магчымасць пераносу кампетэнцыяў, атрыманых у моладзевай працы, на сферу занятасці або прадпрымальніцтва
- Пашырыць прызнанне каштоўнасці кампетэнцыяў, атрыманых у моладзевых праектах

### АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1

Запрасіце вашага ўдзельніка зручна сесці і заплюшчыць вочы... і расслабіцца... і папрасіце яго прытрымлівацца рытму ўласнага дыхання. Папрасіце іх скіраваць сваю ўвагу ўнутр сябе, каб звязацца з рэчамі, якія для іх сапраўды важныя.

Крок 2

Далей працягвайце паводле наступнай інструкцыі:

- Цяпер у вашым уяўленні... вы можаце падарожнічаць у будучыню... І я запрашаю вас убачыць сябе на «працы вашай мары»… і вы вельмі паспяховыя на ёй…
- Скажыце мне, калі ласка… Што вы бачыце?
- Дзе гэта адбываецца?
- З кім вы працуеце?
- Як выглядае ваш тыповы працоўны дзень?
- Як вы бачыце вынікі сваёй працы?
- Якія навыкі патрэбныя, каб рабіць яе добра? (ЗАПІШЫЦЕ ІХ)
- Якія стаўленні дапамагаюць вам быць дасягнуць такога вялікага поспеху? (ЗАПІШЫЦЕ ІХ)
- А зараз са сваёй працы мары паглядзіце на сябе ў мінулым, на свае моладзевыя праекты... і нефармальную адукацыю... чаму вы навучыліся ў рамках гэтай дзейнасці... што дапамагае вам цяпер у працы вашай мары? (ЗАПІШЫЦЕ ІХ)

Крок 3

Цяпер запрасіце ўдзельніка павольна вярнуцца да цяперашняй дзейнасці. Скажыце яму адкрыць вочы.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

Папрасіце ва ўдзельніка хуткую зваротную сувязь пра тое, як прайшло практыкаванне. Потым падзяліцеся сваімі нататкамі. Папрасіце ўдзельнікаў сфармуляваць сваімі словамі, якія асноўныя кампетэнцыі яны набылі падчас моладзевага праекта, і што ім яшчэ трэба даведацца, каб наблізіцца да свайго бачання.

## РАСПРАЦОЎКА

Darko Marković

# 10. ТРЫ КРЭСЛЫ МАЙГО НАВУЧАННЯ

Гэты метад дапамагае візуалізаваць тры асноўныя элементы дадзенай кампетэнцыі: ацэначныя пазіцыі + навыкі + веды.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Для індывідуальнай працы з адным удзельнікам або для групы, падзеленай на пары

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ

60-90 хвілін

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Тры крэслы
- Тры таблічкі: «Веды», «Навыкі», «Ацэначныя пазіцыі»
- Вялікі аркуш паперы для нататак

### МЭТЫ

- Павялічыць абазнанасць пра кампетэнцыі, распрацаваныя ў праекце; у прыватнасці, веды, навыкі і ацэначныя пазіцыі, якія ляжаць у аснове гэтых кампетэнцыяў
- Забяспечыць аснову для самаацэнкі ў рамках сертыфікату Моладзевага пашпарту Youthpass

### АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1

Замацуйце па таблічцы да кожнага з трох крэслаў. Перш чым пачаць практыкаванне, спытаеце ўдзельнікаў, ці яны выразна разумеюць гэтыя тры тэрміны. Напрыклад, у дачыненні да працы ў камандзе «Веды» азначала б, што яны разумеюць, што адкрытае камунікаванне з'яўляецца важным аспектам працы ў камандзе. «Навыкі» адносяцца да здольнасці выказваць сябе адкрыта і выразна. «Ацэначныя пазіцыі» адносіцца да гатоўнасці падзяліцца сваім меркаваннем або пачуць пункты гледжання іншых чальцоў каманды.

Крок 2

Далей паведаміце ўдзельнікам, што ў гэтым практыкаванні ім прапануюць іграць ролі ведаў, навыкаў і ацэначных пазіцый, атрыманых у праекце. Гэта дазволіць ім не толькі пагаварыць пра свае кампетэнцыі, але і адчуць іх.

Крок 3

Потым выконвайце інструкцыі з раздатка.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

Папрасіце ва ўдзельнікаў хуткую зваротную сувязь пра тое, як прайшло практыкаванне. Потым падзяліцеся сваімі нататкамі. Папрасіце іх сфармуляваць сваімі словамі, якія асноўныя кампетэнцыі яны набылі падчас праекта.

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Падчас ролевай гульні пераканайцеся, што ўдзельнікі прытрымліваюцца сваіх роляў і размаўляюць ад першай асобы («Я...»), а не выкарыстоўваюць «Гэта...». Падчас інтэрв'ю з ролямі ствараеце расслабленую атмасферу і выконвайце практыкаванне ў стылі нефармальнай размовы. Удзельнікі не павінны адчуваць сябе як на экзамене або допыце.

Для дапамогі ў запісе вынікаў навучання, смела выкарыстоўвайце іншыя практыкаванні з гэтага дапаможніка, напрыклад, Шпаргалка або Піраміда навучання.

## АДАПТАЦЫЯ

Darko Marković



Важна:
Трымайце асадку пад рукой, каб адразу ж пачаць занатоўваць замест вашага ўдзельніка.

# Тры крэслы майго навучання

Крок 1

Па-першае, пастаўце тры крэслы, якія прадстаўляюць навучанне ў сэнсе Ведаў, Навыкаў і Ацэначных пазіцыяў. Растлумачце, што ў гэтым практыкаванні ўдзельніку прапануецца ўзяць на сябе ролі, звязаныя з гэтымі трыма крэсламі.

Крок 2

Запрасіце ўдзельніка ўзяць на сябе ролю Ведаў, развітых у рамках праекту (папрасіце іх сесці ў крэсла Ведаў). Пасля зрабіце інтэрв'ю з імі ў ролі Ведаў, задаючы ніжэйпералічаныя пытанні (пераканайцеся, што ўдзельнік прытрымліваецца ролі і выступае ад першай асобы («Я...»), а не выкарыстоўвае («Яны...»). У працэсе інтэрв'ю рабіце нататкі за свайго ўдзельніка.

- Вітаю, Веды, прыемна пазнаёміцца! Якога кшталту вы Веды?
- Якія яшчэ ёсць веды?
- Як вы развіваліся ў дадзеным праекце?
- Як вы робіце сябе бачнымі для іншых?
- Як вас можна выкарыстаць у ______________________ жыцці (імя ўдзельніка)?

Крок 3

Падзякуйце Ведам. Потым папрасіце ўдзельніка ўзяць на сябе ролю Навыкаў, развітых у рамках праекту. Дзейнічайце, як і ў папярэднім выпадку: зрабіць інтэрв'ю з Навыкамі і занатаваць.

- Вітаю, Навыкі! Прыемна пазнаёміцца! Якога кшталту вы Навыкі?
- Якія яшчэ ёсць навыкі?
- Як вы развіваліся ў дадзеным праекце?
- Як вы робіце сябе бачнымі для іншых?
- Як вас можна выкарыстаць у ___________________________ жыцці (імя ўдзельніка)?

Крок 4

Падзякуйце Навыкам. Пасля папрасіце ўдзельніка ўзяць на сябе ролю Ацэначных пазіцыяў, развітых у рамках праекту. Паўтарыце працэдуру і занатуйце.

- Вітаю, Ацэначныя пазіцыі, прыемна пазнаёміцца. Якога кшталту вы Ацэначныя пазіцыі?
- Якія яшчэ ёсць Ацэначныя пазіцыі?
- Як вы развіваліся ў дадзеным праекце?
- Як вы робіце сябе бачнымі для іншых?
- Як вас можна выкарыстаць у ___________________________ жыцці (імя ўдзельніка)?

Крок 5

Зараз папрасіце ўдзельніка выйсці з апошняй ролі. Пасля падсумуйце вынікі для іх: «Мы выявілі, што ў гэтым праекце вы атрымалі... (спіс ведаў)... (спіс навыкаў)... (спіс ацэначных пазіцыяў)... гэта можа быць карысна для.... Ці нешта хочаце дадаць?»

Крок 6

Пасля перадайце свае нататкі ўдзельніку і папрасіце яго выкарыстоўваць іх у якасці асновы для запаўнення самаацэнкі.

# 11. ПЕРАНЕСЦІ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

Ацэнка нашага навучання таксама звязана з выяўленнем межаў нашых кампетэнцыяў. Ведаючы, у якой ступені мы можам выканаць пэўную задачу або прымяніць пэўны навык, важна атрымаць рэалістычнае ўяўленне пра свае здольнасці. Таму пасля ацэнкі таго, што даведаліся вашы ўдзельнікі, прыйшоў час спытаць, наколькі яны далёкія ад таго, каб быць Майстрам Ёдам.

## ПАМЕР ГРУПЫ

Любы

## ПРАЦЯГЛАСЦЬ

30 хвілінаў

## РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Раздатак
- Асадка

## МЭТЫ

- Дапамагчы ўдзельнікам адкрыць межы сваіх кампетэнцыяў.
- Атрымаць творчы агляд іх кампетэнцыяў

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1

- Папрасіце ўдзельнікаў запісаць тры рэчы, якія яны даведаліся падчас досведу свайго навучання (напрыклад, моладзевы абмен, валанцёрскі праект або навучальны курс).

Зрабіце ўводзіны да практыкавання, патлумачыўшы: Крок 2

«Пасля ацэнкі таго, што вы ведаеце (напрыклад, я ведаю, як працаваць у камандзе) вы, магчыма, захочаце спытаць, у якіх сітуацыях вы добра сябе праяўляеце».

Праінструктуйце ўдзельнікаў Крок 3

1. занатуйце ў верхняй частцы раздатку адну кампетэнцыю, якую, на іх думку, яны распрацавалі;
2. прачытайце пытанні з раздатку (гл. ніжэй) і адкажыце на тыя пытанні, якія, на іх думку, выклікаюць цікавасць або натхненне.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Як вы сябе адчувалі падчас практыкавання?
- Вам гэта нейкім чынам дапамагло?
- Ці можаце вы прымяніць такое ж практыкаванне да іншых кампетэнцыяў, якія вы развілі?
- Цяпер, калі вы зрабілі практыкаванне, што б вы напісалі па-іншаму ў сваім Моладзевым пашпартце Youthpass?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Гэта практыкаванне заклікае ўдзельнікаў мысліць па-за межамі скрынкі. Гэта можа заблытаць іх адносна сваёй мэты. Некаторым моладзевым працаўнікам прасцей растлумачыць гэта да пачатку практыкавання, каб удзельнікі маглі справіцца з пытаннямі, якія могуць ім падавацца дзіўнымі.

## РАСПРАЦОЎКА

Anita Silva

Кампетэнцыя:



Ці не мог бы я гэта рабіць сам па сабе?

Ці не мог бы я быць героем у гэтай справе?

Ці не мог бы я гэта рабіць на Месяцы?

Ці не мог бы я гэта рабіць са сляпымі людзьмі?

Ці не мог бы я гэта рабіць без падрыхтоўкі?

Ці не мог бы я гэта рабіць у пустыні?



# 12. НАВУЧАЦЦА З ЭМОЦЫЯМІ

Эмоцыі з'яўляюцца важнай часткай навучання, мы часам забываемся згадаць іх або забываемся пра тое, чаму мы навучыліся праз іх. Навучэнец, які быў расчараваны сумнай сесіяй або вельмі ўсхваляваны падчас пацешнага практыкавання, можа азірнуцца назад і прааналізаваць свае пачуцці ў той момант. Гэта практыкаванне можа заахвоціць удзельнікаў думаць пра тое, як эмоцыі ўплываюць на нашы ацэначныя пазіцыі і, значыць, на нашы паводзіны.

## ПАМЕР ГРУПЫ

Любы

## РАЦЯГЛАСЦЬ

30 хвілінаў

## РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Выразаныя выявы (гл. раздатак)
- Асадка і папера

## МЭТЫ

- Вяртанне да перажытых эмоцыяў падчас досведу навучання і навучанне праз іх

## АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

Крок 1
- Павыразайце малюнкі з раздатку і пакладзіце іх у канверт.

Крок 2
- Растлумачце ўдзельнікам, што мэта гэтага практыкавання - даць ім магчымасць запомніць, якія эмоцыі суправаджалі працэс навучання, і дапамагчы ім запісаць тое, што яны даведаліся праз гэтыя эмоцыі.

Крок 3

Інструкцыя для ўдзельнікаў:

- Дастаньце выявы з канверта і выберыце тыя, якія адлюстроўваюць пачуцці або эмоцыі, якія суправаджалі працэс навучання. Абмежаванняў на колькасць малюнкаў, якія вы можаце выбраць, няма, і не мае значэння, адлюстроўваюць яны станоўчыя або адмоўныя эмоцыі.
- Запішыце некалькі сказаў, каб растлумачыць, як вы сябе адчувалі і што вы даведаліся праз гэтыя эмоцыі.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Чаму вы навучыліся праз гэтую эмоцыю?
- Што вы будзеце рабіць з гэтым у будучыні?
- Наколькі гэтая рэфлексія карысная для іншых, напрыклад, для будучага працадаўцы?
- Як вы можаце гэта выказаць у сваім Моладзевым пашпарце Youthpath?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Часам удзельнікам бракуе словаў, каб выказаць свае эмоцыі. Выкарыстанне малюнкаў можа быць карысным для пачатку рэфлексіі, але, у канчатковым выніку, ім трэба будзе сфармуляваць свае эмоцыі ў пісьмовай форме. Калі гэта перашкода, вы можаце прынесці спіс словаў, звязаных з эмоцыямі, на мове групы і падзяліцца ім са сваімі ўдзельнікамі.

## РАСПРАЦОЎКА

Anita Silva

## Эмоцыі:



шчаслівы



падазроны



стомлены



здзійлены



можа быць



сумней



страх



энтузіазм



заблытаны



асуджал



сарказм



злосць



сонны



запытальны



усмешка



спужаны



змрочны



запалены



падспудны



плакаць

# 13. ПАКІНУЦЬ ЦІ ПРЫБРАЦЬ

Вельмі лёгка няправільна інтэрпрэтаваць мэту самаацэнкі, але не так лёгка паведаміць навучэнцу, што тое, што яны напісалі ў сваёй самаацэнцы – пасля таго, як паспрабавалі зрабіць усё магчымае – не зусім адэкватнае. Прафілактыка - моднае слоўца тут. Гэты квіз задуманы як вясёлае практыкаванне, падчас якога мы ўсе можам смяяцца над магчымымі памылкамі самаацэнкі, перш чым яны адбудуцца.

### ПАМЕР ГРУПЫ

Любы

### РАЦЯГЛАСЦЬ

30-50 хвілінаў

### РЭСУРСЫ І ПАДРЫХТОЎКА (ПРАСТОРА, МАТЭРЫЯЛ, АБСТАЛЯВАННЕ, ЛЮДЗІ)

- Папера і асадкі
- Званок, або свісток, або малаток (усё, што можна выкарыстоўваць у квізе, калі ваша каманда гатовая адказаць).
- Раздатак з пытаннямі
- Дошка або фліпчарт для запісу ачкоў кожнай каманды

### МЭТЫ

- Дапамагчы маладым людзям зразумець, што нельга пісаць у самаацэнцы
- Пацешыцца і прадухіліць неадэкватную пісаніну, а таксама дэмістыфікаваць працэс самаацэнкі

### АПІСАННЕ МЕТАДУ КРОК ЗА КРОКАМ

У гэты квіз можна гуляць з асобнымі людзьмі, калі ў вас невялікая група, або вы можаце стварыць каманды, калі група занадта вялікая. У ідэале ў вас не павінна быць больш за пяць асобных канкурсантаў або каманд, каб забяспечыць актыўны ўдзел кожнага.

Раўндаў будзе столькі, колькі вы прапануеце сказаў, над якімі вы хочаце, каб удзельнікі паразважалі, таму адзін сказ = адзін раўнд. Для кожнага раўнду працэдура наступная:

- Вядоўца гульні голасна чытае сказ, з наступным пытаннем: «Гэта трэба пакінуць ці прыбраць?» Крок 1
- Каманды (або асобныя ўдзельнікі) націскаюць на кнопку (або звоняць у званок, або дзьмуць у свісток, ці выкарыстоўваюць іншы спосаб, каб паказаць, што яны гатовыя адказаць). Калі каманда адказвае «пакінуць», гэта азначае, што яны лічаць, што сказ мае сэнс у самаацэнцы. Калі каманда адказвае «прыбраць», яны лічаць, што сказ не пасуе для самаацэнкі. Крок 2
- Вядоўца вырашае, якая каманда адказвае першай, і дае ім слова. Крок 3
- Пасля таго, як першая каманда адкажа, могуць паспрабаваць даць свой адказ любыя іншыя каманды. Адказваючы, каманда мусіць патлумачыць, чаму яны лічаць, што іх адказ правільны. Крок 4
- Вядоўца агучвае правільны адказ і тлумачыць, чаму гэты канкрэтны сказ трэба або пакінуць, або прыбраць з самаацэнкі. Крок 5
- Вядоўца запісвае балы кожнай каманды за кожны раўнд на дошцы або фліпчарце. Крок 6

Сістэма балаў:

Адзін правільны адказ = 10 балаў
Першым, хто адкажа = +5 балаў
Найбольш крэатыўнае абгрунтаванне свайго адказу (нават калі адказ няправільны) = +5 балаў

Заўвага:

Прапанаваныя ў гэтым практыкаванні сказы былі створаныя для стымулявання рэфлексіі і дэбатаў. Вы і вашы навучэнцы не заўсёды павінны пагаджацца пры адказах. Проста дазвольце ўдзельнікам паабмяркоўваць і майце на ўвазе, што мэта ў тым, каб напісаць самаацэнку.

## ПЫТАННІ ПРЫ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ

- Чаму вас навучыў гэты квіз наконт самаацэнкі?
- На што вы звернеце асаблівую ўвагу пры напісанні сваёй самаацэнкі?

## ПРА ШТО ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

Вы можаце зрабіць гэты квіз вельмі простым, як і захапляльным. Апраніцеся ў касцюмы, прыдумайце прызы, дадавайце нейкія фішкі ці выклікі, або проста замест квізу сядайце з удзельнікамі і пытайцеся іх меркаванне пра кожны сказ.

## РАСПРАЦОЎКА

Anita Silva



| Сказы | Пакінуць ці прыбраць? |
| --- | --- |
| Хоць я ўжо размаўляю на трох мовах, падчас гэтага праекта я палепшыў свой узровень англійскай мовы. | **Пакінуць**<br>Самаацэнка вызначае не толькі рэчы, якія вы даведаліся, але і кампетэнцыі, якія вы палепшылі. Тым не менш, важна дадаць тлумачэнне, як менавіта вы палепшылі сваю англійскую мову – у гэтым выпадку. |
| Цяпер я больш упэўнена выказваю свае эмоцыі. | **Пакінуць**<br>Самаацэнка - гэта не толькі пра глыбокія веды, але і пра развіццё кампетэнцыяў наагул. Гэта азначае веды, навыкі і ацэначныя пазіцыі. Адчуванне большай упэўненасці ў выказванні сваіх эмоцыяў з'яўляецца важным крокам у паляпшэнні, напрыклад, вашых навыкаў камунікавання. |
| Мне вельмі спадабалася ежа на месцы правядзення. | **Прыбраць**<br>Самаацэнка - гэта не тое ж самае, што форма ацэньвання. Ідэя тут не ў ацэнцы якасці месца правядзення мерапрыемства, а ў ацэнцы якасці ўласнага навучання. |
| Падчас гэтага мерапрыемства я закахаўся і гэтага ніколі не забуду. | **Прыбраць**<br>Хоць гэта вельмі кранальна, гэта варта напісаць у сваім дзённіку, а не ў самаацэнцы, якую вы магчыма пазней захочаце паказаць працадаўцам або настаўнікам. |

## Сказы

## Пакінуць ці прыбраць?

Я даведаўся шмат новага праз гульні, і я зразумеў, што дзякуючы ім навучаюся лепш.

### Пакінуць
Выдатна! Разуменне таго, якім чынам вы лепш вучыцеся, робіць вас лепшым навучэнцам. І, стаўшы лепшым навучэнцам, вы заўсёды больш чаму навучыцеся. Гэта станоўчая спіраль развіцця кампетэнцыяў!

Паколькі я быў адказным за набыццё квітка(-оў) на самалёт, я шмат даведаўся пра планаванне выправаў.

### Пакінуць
Ваша самаацэнка не павінна тычыцца толькі досведу падчас практыкаванняў. Тое, што вы даведаліся падчас падрыхтоўкі і наступнага назірання, мае аднолькава важнае значэнне, не забудзьцеся згадаць гэта.

Група была вельмі добрая, і ўсім разам было пацешна.

### Прыбраць
Гэта выдатная навіна, але яна не адносіцца да навучальнага аспекту.

Як маладзевы працаўнік, я быў рады бачыць, што Пітэр так актыўна ўдзельнічае ў кожным практыкаванні. (Напісана маладзевым працаўніком у самаацэнцы Пітэра)

### Прыбраць
Калі вы не з'яўляецеся законным уласнікам самаацэнкі, калі ласка, устрымайцеся ад яе напісання. Гэта не ваша! Зрабіць гэта - як напісаць прыватны дзённік за кагосьці іншага. Гэта проста бессэнсоўна, ці не так?

| Сказы | Пакінуць ці прыбраць? |
| --- | --- |
| Я зрабіў практыкаванне, дзе мне давялося выпіць шклянку вады, не дакранаючыся да яе. Я пачаў спрабаваць са скотчам, але гэта не спрацавала. Тады я выкарыстаў крэсла, але разбілася шкло. З новым кубкам я выкарыстаў некалькі матузкоў, а потым справіўся з задачай. Дзякуючы гэтаму, я многаму навучыўся ў кіраванні праектамі. | **Прыбраць**<br>Часам ва ўмовах нефармальнага навучання і эксперыментальнага навучання мы шмат чаму вучымся ў гульнях і практыкаваннях. Падрабязнае апісанне гэтых практыкаванняў можа быць не актуальным для чытача. Акрамя таго, калі практыкаванне падштурхоўвае навучэнца задумацца пра іншыя, больш складаныя канцэпцыі (напрыклад, кіраванне праектамі), важна паказаць сувязь паміж дзейнасцю і тэмай, а таксама тое, як навучэнец разважаў на гэтую тэму. У адваротным выпадку, цяжка зразумець, як практыкаванне з кубкам вады дапамагло ўдзельніку развіць кампетэнцыі кіравання праектамі. |
| Фасілітатары сказалі, што важна быць актыўным у грамадстве, і я згодны з імі. | **Прыбраць**<br>Важна не тое, з кім ты згодны, а тое, у што верыш. У гэтым выпадку вы маглі б зрабіць такую заяву: «Я даведаўся, што важна быць актыўным у грамадстве, таму што...» |
| Пасля гэтага праекту мне захацелася больш вывучаць французскую мову, таму з таго часу, як я вярнуўся дадому, я пачаў хадзіць на штотыднёвыя заняткі разам з двума сябрамі. | **Пакінуць**<br>Ваш навучальны шлях не заканчваецца, калі вы вяртаецеся дадому. Калі вы працягвалі вывучаць пэўную тэму, якая была часткай праекту, гэта паказвае, што вы можаце трымацца сваёй мэты навучання. Гэта моцны навык! (Дарэчы, калі вы не ведаеце, куды гэта пакласці, паспрабуйце раздзел пад назвай «Навучыцца ўменню вучыцца».) |
| Мы шмат якім рэчам навучыліся, але цяпер я іх не ўсё памятаю. | **Прыбраць**<br>Самаацэнка - гэта не пра «Мы», а пра сябе. Акрамя таго, няма сэнсу пісаць пра тое, чаго вы не памятаеце, так? |

## Сказы

## Пакінуць ці прыбраць?

Мой сябар Пітэр, які таксама браў удзел у гэтай дзейнасці, даведаўся шмат новых танцавальных крокаў.

### Прыбраць

У прынцыпе, тое, што даведаўся Пітэр, павінна быць у яго самаацэнцы, а не ў вашай. Таму гэты сказ трэба прыбраць. Аднак, калі наступная фраза будзе «І гэта падштурхнула мяне таксама пачаць танцаваць. Цяпер я танчу тры разы на тыдзень і выступаю кожны тыдзень». Тады было б добра выкарыстаць гэтую фразу... так?

Я палепшыў свае навыкі актыўнага слухання, удзельнічаючы ў двух семінарах па гэтай тэме і практыкуючыся з калегамі. Я стаў больш упэўненым у выкарыстанні метадаў актыўнага навучання. Іншыя ўдзельнікі згадвалі, што яны заўважылі мой прагрэс.

### Пакінуць

Гэта пераможца. Вы тлумачыце, што вы даведаліся, як вы навучыліся і вы паказваеце доказы свайго развіцця. Добрая праца!

Я мала ведаў пра маркетынг да гэтага праекту, але я наведаў сесію па гэтай тэме, і гэта рэальна дапамагло мне лепш яе зразумець. Але мне ўсё роўна патрэбна магчымасць папрактыкавацца. Спадзяюся, што ў хуткім часе атрымаецца.

### Пакінуць

Гэта нармальна - казаць пра тое, што вы раней не ведалі, ці нават пра тое, што вам яшчэ не ўдалося зрабіць. Гэта паказвае, што вы ў стане ацаніць свае патрэбы ў навучанні, і гэта каштоўны навык.

Сказы

# Пакінуць ці прыбраць?

Мой сусед па пакоі вельмі гучна хроп. Таму, каб заснуць, мне прыйшлося ўявіць, што я быў на круізе, а ён быў шумам Атлантычнага акіяну.

### Прыбраць

Добра, калі вы не выкарыстоўваеце гэтую самаацэнку, каб атрымаць працу стэндапера, вы мусіце засяродзіцца на сваёй навучальная сцяжыне, а не на праблемах са сном.

Каманда зрабіла выдатную працу і заўсёды была побач, калі нам гэта было патрэбна.

### Прыбраць

Добра ім. Добра вам. Добра ўсім! Але ваша самаацэнка не пра каманду, а пра вас.

Ружы чырвоныя. Фіялкі блакітныя. Я вывучаў ангельскую паэзію. Для мяне гэта было новым.

### Пакінуць

Трохі пацехі і крэатыўнасці не пашкодзяць вашай самаацэнцы. Проста пераканайцеся, што гэта будзе карысна, калі вы захочаце паказаць самаацэнку патэнцыйным працадаўцам, настаўнікам ці іншым асобам, і што яна дакладна выяўляе вынікі вашага навучання.

Мой працэс навучання па гэтай тэме быў падобны на пральную машыну. Часам ён здаваўся занадта хуткім, і ад такой колькасці інфармацыі ў мяне пачынала кружыцца галава, але цяпер я адчуваю, што пазбавіўся ад старых ідэяў, і ў мяне ёсць новыя яркія маляўнічыя канцэпцыі.

### Пакінуць

Вы можаце выкарыстоўваць вобразы і метафары, каб лепш растлумачыць сваю навучальную сцяжыну, проста пераканайцеся, што вы не заблукалі ў сюжэце. Выкарыстоўваць сваё ўяўленне добра, але не забудзьцеся згадаць тое, чаму вы навучыліся і як канкрэтна.

# 2. ПАРАДЫ І ПАДКАЗКІ

## ПРАЦА НАД ПАТРЭБАМІ

Каб эфектыўна падтрымаць кагосьці ў напісанні самаацэнкі, важна зразумець, якія ў гэтых людзей навыкі пісьма. Некаторыя маладыя людзі выдатныя пісьменнікі, і ім проста трэба зразумець, пра што яны павінны пісаць. Іншыя могуць дакладна ведаць, што яны даведаліся, але не маюць належнага слоўнікавага запасу або досыць моцнай граматыкі, каб апісаць свае вынікі. Разуменне таго, якія навыкі пісьма маюць удзельнікі, дапаможа вам выбраць метады і вызначыць, якую падтрымку вы можаце аказаць. Добрай адпраўной кропкай можа быць проста спытаць удзельнікаў, што на іх думку яны ўжо могуць зрабіць, якія іх асноўныя праблемы ў працэсе напісання, і якая падтрымка можа быць для іх карыснай.

## НАВОШТА МЫ ГЭТА РОБІМ?

Трэба не толькі ведаць, якая падтрымка патрэбная вашым удзельнікам, важна таксама ведаць, для чаго будзе выкарыстоўвацца іх Моладзевы пашпарт Youthpass. Выключна для самаразвіцця? Ці ён будзе выкарыстоўвацца ў мэтах працаўладкавання? Разуменне таго, для чаго вашы ўдзельнікі маюць намер выкарыстоўваць гэты дакумент, дапаможа вам сумесна з імі вызначыць найбольш адпаведны змест і найбольш адэкватны стыль напісання. Для дадатковай інфармацыі гл. раздзел III (Як падтрымаць самаацэнку для Моладзевага пашпарту Youthpass).

## ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ КРОК ЗА КРОКАМ. ПУСТАЯ СТАРОНКА ВЕЛЬМІ ПУЖАЕ.

А ў Альбуса Дамблдора дырэктара школы Хогвартса, была «Затока памяці», міска, дзе ён мог збіраць свае думкі простым рухам сваёй чароўнай палачкі. Мы ўсе хочам, каб напісанне самаацэнкі было такім простым. Насамрэч, гэта зусім не так; гэта больш падобна на пабудову дома. Перад пачаткам будаўнічага праекту варта падрыхтаваць мясцовасць і выбраць інструменты. Тое ж самае тычыцца напісання самаацэнкі. Неабходна зразумець

мэту самаацэнкі і якія ў ёй павінны быць элементы. Выдаткуйце час на падрыхтоўку тэксту перш чым маладыя людзі фактычна пачнуць будаваць сваю самаацэнку крок за крокам. Гэта спросціць для іх выказванне не толькі простых думак, але і больш складаных і поўных ідэяў. Пра тое, як падрыхтаваць працэс напісання, гл. раздзел II (Кампетэнцыі: навучанне, рэфлексія і дакументаванне).

## ХТО БАІЦЦА ВАСЬМІ КЛЮЧАВЫХ КАМПЕТЭНЦЫЯЎ?

Восем ключавых кампетэнцыяў у форме самаацэнкі для Моладзевага пашпарту Youthpass знаходзяцца там, каб дапамагчы ўдзельнікам апісаць вынікі навучання згодна з агульнапрызнанымі катэгорыямі. Для адных гэта сапраўды дапамагае - выкарыстаць гэтыя скрыначкі, а для іншых толькі ўскладняе сітуацыю. Наш падыход просты: выкарыстоўвайце форму, калі гэта ў інтарэсах вашых навучэнцаў. Калі гэта выглядае занадта складана, і ў вас няма часу растлумачыць, што азначае кожная кампетэнцыя, удзельнікі могуць выкарыстоўваць толькі некаторыя з аспектаў кампетэнцыяў. Некаторыя ўдзельнікі могуць выбраць выкарыстоўваць толькі «спецыфічныя кампетэнцыі», «кампетэнцыі, звязаныя з задачай» або «прафесійныя кампетэнцыі» (у залежнасці ад тыпу іх праекту), ці наагул не выкарыстоўваць ключавыя кампетэнцыі. У гэтых выпадках нявыкарыстаныя кампетэнцыі не з'явяцца ў выніковым дакуменце. Каб убачыць некаторыя прыклады таго, што (не) трэба пісаць у самаацэнцы, зірніце на раздатак да практыкавання «Пакінуць ці прыбраць?».

## ЗВЯРТАЙЦЕ ЎВАГУ НА МОВУ

Напісанне самаацэнкі - гэта выбар правільных словаў і выразнае структураванне тэксту, каб прадэманстраваць свае кампетэнцыі ў заяўцы на працу або на сумоўі. Калі вы падтрымліваеце працэс самаацэнкі маладога чалавека або групы, важна, каб вы ведалі пра гэтыя працэсы або, прынамсі, былі ў курсе, як яны працуюць. Ёсць шмат вэб-сайтаў з парадамі і нават прыкладамі камунікавання ў прафесійным кантэксце, напісання рэзюмэ або праходжання сумоўя. Не варта капіраваць гэта ў самаацэнку навучэнца, але такія прыклады могуць натхніць вас - і іх - складаць самаацэнку больш адэкватным чынам.

## «НАВУЧЫЦЦА» - ГЭТА СЛОВА НЕ НЯЗНАЧНАЕ

Яно, магчыма, занадта значнае. Безумоўна, вельмі лёгка трапіць у пастку і, каб выказаць тое, у чым вы кампетэнтныя, выкарыстоўваць толькі гэты дзеяслоў. Нагадайце сабе і навучэнцам, што апісанне таго, што яны даследавалі, чым зацікавілася, пра што разважалі, абмяркоўвалі, што не змаглі выканаць і г.д., гэтак жа важнае, як і тое, чаму яны навучыліся на іх думку. Заахвочвайце навучэнцаў запамінаць усе гэтыя дэталі і тлумачыць свой працэс навучання. Практыкаванне «Шпаргалка» можа быць карысным пры вывучэнні новых спосабаў расказаць пра навучальную сцяжыну вашых удзельнікаў.

## ПРАДСТАЎЦЕ ДОКАЗЫ

Гэтак жа, як адвакат у судзе, навучэнец павінен пераканаць сваіх чытачоў паверыць у тое, што ён заяўляе. Дапамажыце маладым людзям прадставіць доказы кампетэнцыяў, якія яны развілі. Прывядзіце выразныя прыклады сітуацыяў, дзе маладыя людзі выканалі пэўную задачу, праявілі пэўнае майстэрства або прадэманстравалі пэўную каштоўнасць. Падыход STAR можа быць карысным для гэтай мэты. Больш інфармацыі пра гэта - гл. Прыклады стыляў самаацэнкі на старонках 45-46 або выкарыстоўвайце практыкаванне «Пакажыце мне свае STARs».

## ЗРАБІЦЕ ПРАЦЭС ПРЫЕМНЫМ

Напісанне словаў у анкеце можа не ўяўляцца вашаму ўдзельніку пацешным заняткам на вечар, таму ператварыце практыкаванне ў вечарыну з піцай ці зрабіце яго на пляжы. Кожны раз, калі выконваецца крок у працэсе напісання, адзначайце! Скончылі абзац? Уключыце асаблівую музыку! Напісалі пра свае памылкі? Зрабіце сэндвіч! Удалося дабрацца да сярэдзіны? Устаньце і патанчыце! Адзначэнне маленькіх перамогаў значна мацней матывуе, чым святкаванне толькі ў канцы – таму што вы проста адзначаеце, што ўсё скончылася.

# НЕ ПЕРАШЧЫРУЙЦЕ

Нарэшце, памятайце, што мэтай вашых навучэнцаў з'яўляецца напісанне карыснай самаацэнкі, якой яны ганарацца. Няма сэнсу рабіць гэтую задачу настолькі важнай, што яна становіцца дэматывацыяй і крыніцай трывогі. Прызнайце свае межы і межы ўдзельнікаў. Вы не павінны быць кансультантам па кар'еры, і малады чалавек не зробіць кар'еру толькі напісаўшы прафесійную самаацэнку.



## 3. ІНШЫЯ РЭСУРСЫ ПА ГЭТЫХ ТЭМАХ

Вам падабаецца ўсё ў лічбавай форме? Вы з тых людзей, якія бачаць канец кожнага праекту як пачатак новага падарожжа? Выдатна! Мы не хочам, каб вы засталіся з пустымі рукамі, таму вось некалькі рэсурсаў, якія могуць быць карыснымі, незалежна ад таго, які шлях вы выбераце.

*Працягвайце гуляць; працягвайце чытаць і працягвайце ствараць новыя рэсурсы.*

### ПРАЦЯГВАЙЦЕ ГУЛЯЦЬ

Вось некалькі прыкладаў гульняў або гейміфікаваных платформаў, якія вы можаце выкарыстоўваць, каб разглядзець дасягненні ў навучанні з вашымі ўдзельнікамі.

Карткі па нестандартным навучанні

- https://www.youthpass.eu/da/youthpass/downloads/learning-out-of-the-box/

Адкрытыя бэджы

- http://openbadges.org

# ПРАЦЯГВАЙЦЕ ЧЫТАЦЬ

Хочаце паглыбіцца ў Моладзевы пашпарт Youthpass? Вось некаторыя публікацыі.

Разгорнута пра Моладзевы пашпарт YouthPass
- https://www.youthpass.eu/en/publications/youthpass-unfolded/

Адзін на адзін – падтрымка навучання твар да твару
- https://www.youthpass.eu/en/publications/handbooks/

Час пахваліцца – даклад пра даследаванні
- https://www.youthpass.eu/en/publications/others/

Моладзевы пашпарт Youthpass для ўсіх! Прызнанне навыкаў маладых людзей з меншымі магчымасцямі
- https://www.salto-youth.net/downloads/4-17-1949/YouthpassForAll.pdf

Даследаванне ўплыву нефармальнай адукацыі ў моладзевых арганізацыях на магчымасці для працаўладкавання моладзі
- http://issuu.com/yomag/docs/reportnfe_print

## ПРАЦЯГВАЙЦЕ СТВАРАЦЬ

Калі вы проста не можаце спыніцца ствараць новыя інструменты, вось некалькі інтэрнэт-рэсурсаў, якія могуць быць карыснымі.

### Выкарыстоўвайце выявы

Прадстаўляйце ідэі візуальна. Візуалізуйце індывідуальны або групавы працэс навучання. Даследуйце выкарыстанне Моладзевага пашпарту Youthpass для кожнага ўдзельніка або прадстаўляйце нядаўна атрыманыя кампетэнцыі. Сеціва напоўненае інструментамі для стварэння эфектных малюнкаў і інфаграфікі. Вось некалькі нашых любімых на дадзены момант:

- http://easel.ly
- https://www.canva.com
- http://piktochart.com

Адаптаваны шаблон з www.easel.ly, які ўяўляе сабой інструмент самаацэнкі для моладзевага абмену:



## Выкарыстоўвайце ментальныя карты

Ментальныя карты могуць дапамагчы нам «бачыць» нашы думкі больш структуравана, што можа значна палегчыць фармуляванне вынікаў навучання. Вы можаце выкарыстоўваць іх разам з удзельнікамі ў якасці інструмента для адлюстравання мэтаў і вынікаў навучання або для пераліку розных мэтаў, для якіх можна выкарыстаць Моладзевы пашпарт Youthpass. Яны могуць выкарыстоўвацца індывідуальна або сумесна. Вядома, вам не патрэбны анлайн-інструмент, каб скласці ментальную карту, але калі вы аддаяце перавагу манітору, гэтыя сайты вам спадабаюцца.

- http://www.mindomo.com
- https://www.mindmeister.com
- http://mindmapfree.com

## Выкарыстоўвайце гісторыі

Ёсць гісторыі, якія трэба расказаць. Магчыма, адзін з вашых удзельнікаў заўсёды марыў напісаць кнігу, а можа быць, нехта хоча весці блог. Гэтыя інструменты дапамогуць ім удасканаліць свае гісторыі іператварыць любы досвед навучання ў эпічнае падарожжа.

- https://storybird.com
- http://www.dipity.com
- http://www.storyboardthat.com
- https://www.storyjumper.com/main/help

Адаптаваны прыклад анімацыі, створаны пры дапамозе www.storyboardthat.com у якасці інструменту самаацэнкі для досведу валанцёрства:

У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ Я РЫХТАВАЎСЯ ДА НОВАГА ВЫКЛІКУ Ў ПЛАНЕ НАВУЧАННЯ, ТАМУ ЗВЯРНУЎСЯ ПА ПАРАДУ ДА МОЛАДЗЕВАГА ПРАЦАЎНІКА Ў СВАЁЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

Я ПАЕХАЎ У БАЛГАРЫЮ І ПРАЦАВАЎ У ПРАГРАМЕ ПА РАЗВІЦЦІ ЖЫЦЦЁВЫХ НАВЫКАЎ МАЛАДЫХ ЛЮДЗЕЙ. ПАДЧАС ГЭТАГА ПРАЕКТУ Я ШМАТ ЧАМУ НАВУЧЫЎСЯ ПРА ПРАЦУ З ГРУПАМІ ЯК ФАСІЛІТАТАР.

ЦЯПЕР Я СПАДЗЯЮСЯ РЭАЛІЗАВАЦЬ СВАЕ НЯДАЎНА НАБЫТЫЯ НАВЫКІ Ў БУДУЧАЙ ПРАЦЫ.




## Выкарыстоўвайце фільмы

Выкарыстоўваючы здымкі або анімацыю, вы можаце зрабіць выдатныя відэаролікі простымі ў выкарыстанні інструментамі. Напішыце сцэнар да навучання, дазвольце навучэнцам ствараць уласную анімацыю або здымаць «жыццё» кампетэнцыі. Проста працягвай падсілкоўваць гэтыя ідэі. Святло, камера, матор!

- http://www.powtoon.com
- http://animoto.com
- http://www.videoscribe.co

## Выкарыстоўваць сайты на тэму занятасці

Занятасць - тэма дня: ад вэбінараў пра складанне CV да блогаў кар'ерных кансультантаў. Ёсць шмат сайтаў з выдатнымі артыкуламі, падручнікамі, праграмамі і іншымі рэсурсамі, каб натхніць вас і вашых навучэнцаў працягваць працу з самаацэнкай як профі.

- http://www.youthcentral.vic.gov.au/jobs-careers
- https://www.themuse.com/advice
- http://www.theguardian.com/careers
- http://www.skillsforemployment.org/
- http://www.workcoachcafe.com
- https://www.ivyexec.com
- https://www.visualcv.com

## Карыстайцеся сайтам Youthpass

youthpass.eu - гэта анлайн-дом, дзе вам заўсёды рады. Ён прапануе пакрокавыя інструкцыі, адказы на частыя пытанні і тэхнічную інфармацыю разам з некаторымі карыснымі парадамі, як падтрымаць маладых людзей у напісанні вынікаў іх навучання. Праверце самі

- https://www.youthpass.eu

Які б рэсурс вы ні абралі, памятайце найважнейшы з усіх рэсурсаў гэта матывацыя працягваць вучыцца.

У добры шлях!

# V ПРА ЎКЛАДАЛЬНІКАЎ

## ANITA SILVA

Аніта Сільва - міжнародная трэнерка і кансультант з Партугаліі. Яна мае вялікі досвед у нефармальных падыходах да адукацыі ў сферы міжнароднай моладзевай працы, вышэйшай адукацыі, працы ў супольнасцях і нават карпаратыўнага сектару. Яна з'яўляецца дырэктарам Team MAIS, кансалтынгавай кампаніі, якая дапамагае арганізацыям зрабіць крок наперад, выкарыстоўваючы інавацыйныя і супольныя метады. Яна мае ступень магістра ў сферы крэатыўнасці і інавацыяў і любіць браць людзей у падарожжа за межы іх ментальных рамак. Як адукатар супольнасцяў, Аніта займаецца некалькімі сацыяльнымі праектамі і з'яўляецца заснавальніцый Clowncare, НДА, якая арганізуе візіты прафесійных клоўнаў у цэнтры пажылых людзей.

## DARKO MARKOVIĆ

Дарко Марковіч з Бялграда, Сербія, пазаштатны трэнер, коўч і кансультант. Яго ўзаемадзеянне з грамадзянскай супольнасцю і моладзевай працай пачалося ў сярэдзіне 1990-х гадоў у адказ на неабходнасць падтрымкі мірнага працэсу на Балканах і ўмацавання грамадзянскага ўдзелу ва ўсіх сферах кволай дэмакратыі. У рамках сваёй працы ў Сербіі ён зрабіў значны ўнёсак у развіццё моладзевай працы, моладзевай палітыкі і нефармальнай адукацыі ў краіне. У пачатку 2000-х гадоў ён стаў удзельнічаць у міжнароднай працы з моладдзю, спачатку працуючы з Радай Еўропы, а потым з моладзевай праграмай ЕС. З тых часоў ён працаваў у больш чым 30 краінах з шырокім спектрам мэтавых груп, уключаючы моладзевых працаўнікоў, трэнераў, ментараў, коўчаў, настаўнікаў, палітыкаў, кіраўнікоў бізнесу і іншых, часта спрыяючы стратэгічным працэсам. Сярод яго асноўных кірункаў зацікаўленасці і экспертызы - развіццё лідарства, сістэмныя змены, арганізацыйная трансфармацыя, міжкультурная кампетэнцыя і лепшае прызнанне нефармальнага навучання. Ён з'яўляецца чальцом Кансультацыйнай групы Youthpass і аўтарам некалькіх даведнікаў і публікацыяў.

## PAUL KLOOSTERMAN

Паўль Клёстэрман шмат гадоў працаваў у міжнароднай адукацыйнай сферы трэнерам, кансультантам, даследчыкам і пісьменнікам. Ён праводзіў і да гэтага часу праводзіць навучальныя курсы для трэнераў, настаўнікаў, палітыкаў і моладзевых працаўнікоў. За апошнія дзесяць гадоў ён засяродзіўся галоўным чынам на навучанні ўменню вучыцца. Ён з'яўляецца суаўтарам «Даведніка для фасілітатараў: навучанне ўменню вучыцца на практыцы» і «Навучанне ўменню вучыцца: міжнародныя аспекты тэорыі і практыкі.» Ён з'яўляецца чальцом Кансультацыйнай групы Моладзевага пашпарту Youthpass, якая адказвае за рэалізацыю схемы Youthpass у еўрапейскіх моладзевых праграмах. У апошнія гады ён удзельнічаў у розных навукова-даследчых праектах, якія тычацца навучання ўменню вучыцца і самакіраванага навучання ў моладзевай працы і навучанні.

# VI ПРА РЭСУРСНЫ ЦЭНТР ТРЭНІНГАЎ І СУПРАЦОЎНІЦТВА SALTO І YOUTHPASS

Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO падтрымлівае Еўрапейскую камісію і Нацыянальныя агенцтвы еўрапейскіх моладзевых праграм у распрацоўцы і рэалізацыі стратэгіі Моладзевага пашпарту Youthpass і Еўрапейскай стратэгіі прафесійнай падрыхтоўкі (ETS). SALTO імкнецца палепшыць якасць стратэгій навучання і дзейнасці ў моладзевай сферы, а таксама пашырыць прызнанне нефармальнага навучання праз моладзевую працу па ўсёй Еўропе. Рэсурсны цэнтр распрацоўвае Моладзевы пашпарт Youthpass ад імя Еўрапейскай камісіі і садзейнічае прызнанню нефармальнага і інфармальнага навучання і моладзевай працы шляхам каардынацыі навучальнай дзейнасці і прадстаўлення навучальных матэрыялаў па гэтых тэмах. З дапамогай распрацаваных стратэгіяў, працэсаў, дзейнасці і інструментаў Рэсурсны цэнтр садзейнічае развіццю кампетэнцыяў трэнераў, моладзевых працаўнікоў і супрацоўнікаў нацыянальных агенцтваў.

Моладзевы пашпарт Youthpass - гэта інструмент дакументавання і прызнання вынікаў навучання ў моладзевай працы і дзейнасці, накіраванай на ўмацаванне салідарнасці. Ён даступны для праектаў, якія фінансуюцца еўрапейскімі моладзевымі праграмамі. Гэта частка стратэгіі Еўрапейскай камісіі па садзейнічанні прызнанню нефармальнага навучання, прымяненню палітыкі на практыцы і практыкі ў палітыцы.

У рамках падрыхтоўкі да гэтай публікацыі і Рэсурсны цэнтр Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO і Балгарскае Нацыянальнае агенцтва праграмы Erasmus+ «Моладзь « правялі семінар пад назвай «Ад дзённіка да сертыфіката», падчас якога абмеркавалі кантэкст і ідэю публікацыі і праверылі некаторыя з метадаў. Водгукі ўдзельнікаў семінара ў значнай ступені спрыялі канчатковаму падбору дапаможных метадаў і парадаў, якія былі ўключаныя ў дадзеную публікацыю.

**Апублікавана**

JUGEND für Europa/SALTO Training & Cooperation Resource Centre,

Godesberger Allee 142 – 148, 53175 Bonn, Germany

**Адказны за публікацыю**

Hans-Georg Wicke

**Каардынацыя і рэдагаванне**

Kristiina Pernits, pernits@jfemail.de

Eda Bakir, bakir@jfemail.de

Gisele Evrard Marković, gisele@jfemail.de

**Аўтары**

Anita Silva, info@clowncare.pt

Darko Marković, darko@innside.co.rs

Paul Kloosterman, paul@pameambro.org

**Карэктура**

Karin Walker, Бон

**Макет і ілюстрацыі**

Mandy Krühne, www.kreativraum.de

**Юрыдычны прадстаўнік**

IJAB – Міжнародная служба па справах моладзі Федэратыўнай Рэспублікі Германія Рэпрадукцыя і выкарыстанне ў некамерцыйных мэтах дапускаецца пры пазначэнні крыніцы www.youthpass.eu.

Гэты даклад быў апублікаваны ў кастрычніку 2019 года.

Дадзены дакумент не абавязкова адлюстроўвае афіцыйныя погляды Еўрапейскай камісіі або Рэсурснага цэнтру Трэнінгаў і Супрацоўніцтва SALTO або арганізацыяў, якія супрацоўнічаюць з імі.

**Беларускі пераклад**

Пераклад гэтага выдання на беларускую мову падтрымала Праграма занятасці і прадпрымальнасці моладзі EU4Youth, якую разам прафінансавалі Еўрапейская Камісія і Міністэрства замежных спраў Літвы, супольна з Рэсурсным цэнтрам Усходняй Еўропы і Каўказа SALTO.

**Перакладчык**

Алесь Лагвінец

**Карэктар**

Аляксей Дзеніс

9 783982 689715

Гэтая публікацыя фінансуецца:

Bundesministerium für Familie, Senioren, Frauen und Jugend

Co-funded by the European Union

Ministry of Foreign Affairs Republic of Lithuania

LTAID

CPVA Central project management agency

SALTO Eastern Europe & Caucasus

Erasmus+ Enriching lives, opening minds.